

КАНСТЫТУЦЫЯ: СТРАХОЎКА АД РАДЫКАЛЬНЫХ ЗМЕН 3



ЖАНЧЫНЫ, ГІСТОРЫІ, ВОКЛАДКІ 5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

15 САКАВІКА 2024 г. ПЯТНІЦА № 53 (30187)

# АДКАЗНАСЦЬ КОЖНАГА ЗА ЛЁС АЙЧЫНЫ

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сёння мы адзначаем Дзень Канстытуцыі, якая стала сапраўды народным дакументам. Прыняты 30 гадоў таму і ўдасканалены на рэферэндумах воляй большасці беларусаў, Асноўны Закон шмат у чым вызначае ход нашай гісторыі.*

*Дзякуючы Канстытуцыі створаны ключавыя інстытуты дзяржаўнай улады, гарантаваны правы і свабоды грамадзян.*

*Голас народа, аддадзены за пераемнасць найлепшых традыцый мінулай эпохі, стаў залогам захавання міру і згоды ў грамадстве. Беспрэцэдэнтны давер грамадзян Беларусі палітычнай сістэме даў магчымасць пабудаваць стабільную і незалежную дзяржаву. А замацаваныя ў Асноўным Законе фундаментальныя каштоўнасці, такія як сацыяльная справядлівасць, традыцыйная сям'я, гістарычная праўда, з'яўляюцца для нас дакладнымі арыенцірамі, якія дапамагаюць пераадольваць сучасныя выклікі і ўпэўнена глядзець у будучыню.*

*Сімвалічна, што сёлета ўпершыню ў канстытуцыйным статусе пачне сваю работу Усебеларускі народны сход. Выступіўшы ў новай ролі, вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя стане яшчэ адной магутнай апорай нашай дзяржаўнасці.*

*Упэўнены, захаванне канстытуцыйных норм і прынцыпаў, адказнасць кожнага беларуса за лёс Айчыны будуць і ў далейшым садзейнічаць дынамічнаму развіццю нашай дзяржавы.*

*Са святам! З Днём Канстытуцыі!*

*Жадаю ўсім добрага здароўя, шчасця, дабрабыту і новых поспехаў на карысць роднай Беларусі.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Юнакам і дзяўчатам з розных куткоў Беларусі гэтымі днямі ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюць пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Ганна КАСАБУЦКАЯ з Казялужскай сярэдняй школы Хойніцкага раёна, Елісей ЛЮСІН з гімназіі Мядзела і Таццяна САК, вучаніца сярэдняй школы № 11 г. Пінска, атрымалі свой галоўны дакумент у Канстытуцыйным Судзе.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У дзяржавы і праваслаўнай царквы шмат пунктаў судакранання»

## Падрабязнасці сустрэчы Прэзідэнта з Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы



Фота БелТА.

**Па прыбыцці кіраўніка дзяржавы ў Мінскае епархіяльнае ўпраўленне, дзе адбылася размова са свяшчэннаслужыцелямі, Аляксандр Лукашэнка ў суправаджэнні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, наведаў храм Сабору Усіх Беларускіх святых. Прэзідэнт і мітрапаліт Веніямін запалілі свечкі. Па запрашэнні ўладыкі кіраўнік дзяржавы пабываў у бібліятэцы, дзе азнаёміўся з рэдкімі экзэмплярамі кніг, а таксама ў кабінеце, у якім працаваў Філарэт, ганаровы Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў мітрапаліту Веніяміну за тое, што ўсё захавана ў першапачатковым выглядзе, і згадаў свае сустрэчы з Філарэтам.**

**Перад тым, як звярнуцца да Сінода Беларускай праваслаўнай царквы, Аляксандр Лукашэнка выказаў словы падзякі ўладыку Веніяміну за запрашэнне прыняць удзел у Сінодзе, які з'яўляецца найвышэйшым органам кіравання Беларускай праваслаўнай царквы. У склад Сінода па пасадзе ўваходзяць архірэі, якія кіруюць праваслаўнымі епархіямі, размешчанымі на тэрыторыі нашай краіны. Узначальвае Сінод Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

### «МІЖКАНФЕСІЙНЫ МІР — НАЙГАЛОЎНЕЙШАЕ ДАСЯГНЕННЕ БЕЛАРУСІ»

Як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, у нашай краіне закладзены трывалыя асновы ўзаемадзеяння Беларускай праваслаўнай царквы і дзяржавы. «Інакш і быць не магло: гісторыя праваслаўя на беларускіх землях непарыўна звязана з гісторыяй станаўлення нашай дзяржаўнасці, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Тут, на стыку цывілізацый, не раз разгортвалася арэна ваенных дзеянняў».

СТАР. 2

Падзея

# СВЯТА КНІГІ СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

## XXXI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш урачыста адкрылася ў Мінску

**Ужо з раніцы ў выставачным цэнтры «БелЭкспа» было даволі шматлюдна. Госці з цікавасцю разглядалі ўнікальныя выданні, даведваліся пра новых аўтараў і набывалі нешта для сваёй асабістай бібліятэкі. Дарэчы, штогод мерапрыемства наведваюць дзясяткі тысяч аматараў кнігі. І гэты год відавочна не стане выключэннем. Насычаная праграма, удзельнікі з 20 краін свету і шмат цікавых выданняў — усё гэта стварае ўнікальную атмасферу кніжнага свята.**

На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** заявіў, што кніжная выстаўка-кірмаш кожны год пашырае гарызонты кнігавыдавецтва і дае магчымасць акунуцца ў новыя разважанні, сэнсы, новыя падыходы па-сапраўднаму адказных за справу аўтараў з Беларусі і сяброў з-за мяжы.

Таксама ён адзначыў высокі ўзровень кніжнай выстаўкі-кірмашу.

— Калі б знак якасці можна было прысуджаць падзеям і мерапрыемствам, каля лагатыпа нашай выстаўкі-кірмашу трэба было б размясціць гэты знак, — дадаў ён.

СТАР. 4



Фота Лізаветы ГОЛАД.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!
Ідзе падпіска на II квартал 2024 года
ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «У дзяржавы і праваслаўнай царквы шмат пунктаў судакранання»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У такіх умовах вельмі складана было сфарміравацца і заявіць аб сабе асобнаму народу, не кажучы ўжо аб стварэнні дзяржавы. У беларусаў гэта атрымалася. Шмат у чым дзякуючы духоўнаму стрыжню продкаў. Таму ў дзяржавы і праваслаўнай царквы шмат пунктаў судакранання».

Прэзідэнт з жалем адзначыў, што сёння сусветнае праваслаўе перажывае няпростыя часы, і мы гэта вымушаны прызнаць. «Немагчыма без болю глядзець на рэлігійнае супрацьстаянне ў нашай брацкай Украіне: захоп храмаў, крымінальны пераслед святароў, барацьба за галоўную святыню нашага праваслаўя — Кіева-Пячэрскую лаўру, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Трагедыя разгараецца і на Святой зямлі, якая мае сакральнае значэнне для ўсіх сусветных рэлігій. На жаль, мы бачым спробы ўцягнуць у гэты канфлікт як мага больш іншых краін і народаў».

Па словах Прэзідэнта, асаблівасцю Беларусі з'яўляецца тое, што цэнтры кіравання традыцыйных канфесій размешчаны за межамі краіны. «Як мы бачым, сёння шэраг з іх апынуліся ў эпіцэнтры ўзброеных канфліктаў, — дадаў ён. — Усе самыя кровапралітныя войны на зямлі пачыналіся на глебе рэлігійных рознагалоссяў. Гэтую карту і сёння разыгрываюць ідэолагі «каляровых рэвалюцый» і мяцяжоў».

У такіх умовах, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, важна захаваць роўнасць правоў і дыялог паміж прадстаўнікамі ўсіх веравызнанняў. «Бо яшчэ ўладыка Філарэт адзначаў, што міжканфесійны мір — найгалоўнейшае дасягненне Беларусі, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Складаны знешнепалітычны кантэкст, на шчасце, не адбіўся на традыцыях добрасуседства і верацярпімасці беларусаў. Этнаканфесійныя адносіны ў нашай краіне характарызуюцца ўстойлівасцю і стабільнасцю».

Прэзідэнт адзначыў, што ў той жа час наша грамадства адчувае беспрэцэдэнтны ціск на ўзроўні ідэй і каштоўнасцяў. «З аднаго боку, гэта звязана з небывалымі тэмпамі развіцця тэхналогій (маю на ўвазе перш за ўсё ўкараненне штучнага інтэлекту, сучасныя сродкі камунікацый і іншае), — удакладніў ён. — З іншага — нам навязваюць загадзя дэструктыўныя, разбуральныя для грамадства і дзяржавы ідэі ўсёдазволенасці, спажывецтва, бяздзетнасці, ЛГБТ і іншыя».

## «СПРАВА ЦАРКВЫ — ЗАДАВАЦЬ МАРАЛЬНЫЯ ХРЫСЦІЯНСКІЯ АРЫЕНЦІРЫ»

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што грамадства не паспявае выпрацоўваць агульнапрынятыя нормы паводзін, чалавеку складаней зрабіць правільны маральны выбар. «Многія шукаюць і не знаходзяць адказы на вечныя пытанні: хто я, навошта я, якое ўвогуле маё прызначэнне, — заўважыў ён. — На жаль, усё радзей па гэтыя адказы людзі ідуць у царкву. Царква чакае, што людзі самі прыйдуць да Бога. Мне здаецца, што гэта працэс сустрэчны — і Царква павінна зрабіць крок насустрач простаму чалавеку. Трэба вучыцца несці слова Божае так, каб яно было зразумела кожнаму. У грамадстве ёсць запыт на жывое дзейснае слова пастыра».

Дзяржава высока шануе агульнапрызнаны аўтарытэт нашых праваслаўных іерархаў. «Да вас прыслухоўваюцца мільёны нашых суайчыннікаў, — звярнуўся да прысутных кіраўнік краіны. — Таму сённяшняя сустрэча мае вялікае значэнне ў сучасных геапалітычных умовах і напярэдадні важных палітычных падзей, і ўнутры нашай краіны. Мы памятаем, як у 2020 годзе некаторыя святары, на жаль, некаторыя і праваслаўныя, занялісія, мякка кажучы, палітыкай. Скажу: для гэтага ў дзяржаве ёсць спецыяльныя інстытуты і падрыхтаваныя людзі. Справа Царквы — задаваць маральныя хрысціянскія арыенціры».

Беларускі лідар прапанаваў пастарацца адказаць на пытанне: ці ўсё мы робім для таго, каб чужыя людзі з нядобрымі думкамі не ступілі ў нашы храмы, не сталі мяняць нашы ўстоі, дыктаваць, як нам жыць? «Як Прэзідэнт і кіраўнік шматканфесійнай дзяржавы, у якой Беларуская праваслаўная царкве адведзена не галоўная, а асаблівая роля, хацеў бы пачуць, чаго не хапае Царкве і што яшчэ трэба зрабіць дзяржаве, дзе мы, магчыма, упусцілі сітуацыю, — дадаў ён. — Па-гаспадарску падысці да тых пытанняў, якія сёння трэба вырашаць. Яшчэ раз хачу падкрэсліць: па-гаспадарску».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якую практычную частку работы па лячэнні хвароб нашага грамадства святары гатовы ўзяць на сябе і ці гатова сама Царква мяняцца, не змяняючы пры гэтым духоўным ідэалам і каштоўнасцям? Кіраўнік дзяржавы заклікаў членаў Сінода да грунтоўнай размовы. Пры гэтым акрэсліў галоўную ўмову — дыялог павінен быць сумленным, шчырым і адкрытым.

## «ЦАРКВА РОБІЦЬ І БУДЗЕ РАБІЦЬ УСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ ЗБЕРАГЧЫ ТОЕ, ШТО СТАГОДДЗЯМІ ВЫЗНАЧАЛА СУТНАСЦЬ НАШАГА НАРОДА»

Сваім бачаннем сучаснага свету падзяліўся і мітрапаліт Веніямін. Ён засяродзіў увагу на пытаннях, ад якіх, па яго меркаванні, залежыць будучыня нашай краіны і беларускага народа.

Мітрапаліт Веніямін падкрэсліў, што асновай унутранай сілы нашага народа з'яўляецца хрысціянства. А для большасці — праваслаўе, якое прынесла на нашы землі не толькі высокія маральныя каштоўнасці, але і вызначыла саму ідэю дзяржаўнасці як агульнага служэння кожнага на сваім месцы. Патрыяршы Экзарх указаў на важнасць устанаўлення даверлівых адносін паміж уладай і народам, на адзінства і імкненне да ўзвышэння маральнага і духоўнага жыцця як асновы міру і згоды ў грамадстве. Ён падкрэсліў, што Царква робіць і будзе рабіць усё магчымае, каб зберагчы тое, што стагоддзямі вызначала сутнасць нашага народа, — традыцыйныя хрысціянскія каштоўнасці, разумеючы, што іх разбурэнне прывядзе да страты духоўнага стрыжня, унікальных асноў нашай дзяржаўнасці.

Патрыяршы Экзарх звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі шмат зроблена для таго, каб супрацьстаяць розным негатыўным з'явам. Ён выказаў удзячнасць Прэзідэнту за ўвагу да пазіцыі Беларускай праваслаўнай царквы ў пытанні замацавання палажэнняў аб духоўных асновах нашага грамадства ў Асноўным Законе краіны, а таксама за запрашэнне прыняць удзел у абмеркаванні праекта Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі.

«Супрацьстаянне ў духоўнай сферы — гэта барацьба на нябачным фронце, дзе нам прапаноўваюць ідэі, сутнасць якіх часта схавана пад знешняй прывабнасцю, нават набожным убраннем, — перакананы мітрапаліт Веніямін. — Распазнаецца іх сапраўдная сутнасць часта толькі тады, калі з'яўляецца іх плён, не спрыяльны для нас, для грамадства».

У сувязі з гэтым уладыка звярнуўся да кіраўніка дзяржавы з просьбай — пры канчатковай дапрацоўцы Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі яшчэ раз паглядзець на духоўную сферу грамадства, яе абарону ад пагроз, што ўзнікаюць. Бо тут, як падкрэсліў мітрапаліт Веніямін, неабходна працаваць на апярэджанне.

## ПРА ДУХОЎНУЮ ПАНДЭМІЮ, НАПАЎНЯЛЬНАСЦЬ ХРАМАЎ І ЖЫВОЕ СЛОВА

У размове з кіраўніком дзяржавы члены Сінода Беларускай праваслаўнай царквы закранулі шырокі спектр пытанняў. У прыватнасці архіепіскап Феадосій, ганаровы настаяцель прыхода храма іконы Божай Маці «Неспадзяваная Радасць» (г. Навапалацк), указаў на праблему брыдкаслоўя ў сучасным грамадстве. Па яго словах, гэта духоўная пандэмія, з якой неабходна змагацца.

Святар расказаў, што рос у пасляваенныя гады ў ваенным гарадку, але ні ў сям'і, ні ў вайсковай часці сярод салдат, ні ў школе ён не чуў брыдкаслоўя. «Цяпер гэта духоўная пандэмія, — падкрэсліў ён. — Лаюцца і мужчыны, і жанчыны, і старыя, і дзеці. І ў гэтым вялікая духоўная небяспека. Гэта няпростая сацыяльная і духоўная з'ява. Гэтае разводдзе разліваецца па нашай святой зямлі. Пара б звярнуць на гэта пільную ўвагу».

Архіепіскап Феадосій выказаў удзячнасць Прэзідэнту за ўвагу да Беларускай праваслаўнай царквы. Пры гэтым адзначыў, што цяпер няпросты час, які патрабуе ад кіраўніцтва краіны, усяго дзяржапарату, беларускага народа вялікіх намаганняў, каб захаваць стабільнасць і дабрабыт. «У гэты час выпрабаванняў на трываласць нашай дзяржавы Царква была і будзе побач з вамі», — запэўніў святар і нагадаў словы ўладыкі Філарэта, які казаў, што дзяржава — гэта цела народа, а Царква — яго душа.

Закранулі падчас сустрэчы і тэму царкоўнай адукацыі. «Я ўвогуле прыхільнік адукацыі, асабліва царкоўнай, яна вельмі моцная, — заўважыў беларускі лідар. — Я не дарма казаў, што гэта не справа, калі ў нас стыпендыі — рубель — у вашых навучэнцаў і ў міру. Мы неяк ураўноўвалі і дагэтуль я кожны год падпісваю рашэнне аб даплатах выкладчыкам і нашым хлопцам, якія вучацца ў духоўных школах. Гэта вельмі важна. Я заўсёды падтрымліваў і буду гэта падтрымліваць, бо гэта вельмі добрая адукацыя. Там, акрамя адукацыі, яшчэ і выхаванне добрае — тое, чаго не хапае часам у мірскіх школах».

Прэзідэнт звярнуў увагу і на тое, што не ўсе храмы напоўнены прыхаджанамі. «Ёсць праблема, давайце яе хаваць не будзем, — канстатаваў ён. — Тут нам трэба актывізавацца. Таму, калі з'яўляюцца пытанні аб будаўніцтве новых храмаў, я задаю пытанне ўраду: «А мы тыя, дзясятак, пабудавалі?» «Не». У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы заклікаў святароў падумаць над тым, як прыцягваць людзей у храмы. Проста размовамі, на яго думку, не атрымаецца. «Трэба быць бліжэйшымі да народа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Напрыканцы сустрэчы кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сітуацыя ў свеце няпростая. «Нам з людзьмі трэба размаўляць і даводзіць усё гэта, мала таго, і ў душу зазірнуць, — канкрэтызаваў ён. — Акрамя Царквы, тут складана будзе камусьці гэта зрабіць. Таму я ўдзячны вам за гэтую сустрэчу, гэтую размову. Не бачу тут непераадольных праблем. Думаю, уладыка, мы з імі справімся. Паглядзім, як гэта лепш зрабіць».

Па словах Прэзідэнта, перад грамадствам стаяць вельмі сур'ёзныя праблемныя пытанні. «Мы павінны на іх аб'ектыўна глядзець і бачыць свае недахопы, — скіраваў ён. — Хочуць хаос стварыць, бо не хочацца шматпалярнага свету. Хочацца амерыканцам кіраваць светам, як раней. Але нам трэба прайсці гэты шлях. Мы праврёмся. З Божай дапамогай». Але і самім варта рухацца, паведаміў беларускі лідар і нагадаў вядомае: «На Бога спадзявайся, але і сам старайся».

У памяць аб сустрэчы, з удзячнасцю за шчырую і даверлівую размову ўладыка перадаў у дар Прэзідэнту Біблію. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў за падарунак і пагадзіўся, што ў сучасных умовах вельмі важнае жывое слова. «Яно нас уратуе і ад штучнага інтэлекту, і іншага. Нам трэба размаўляць з людзьмі. Ад вас многае залежыць. Як ніколі жывое слова запатрабавана», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Веранiка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# БЫЦЬ ПАТРЫЁТАМ

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ўручыў пашпарты маладым беларусам

**Урачыстасць адбылася ў рамках Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», ініцыіраванай ГА «БРСМ» у 2004 годзе. З таго часу яна набыла вялікую папулярнасць і стала ўжо традыцыйнай. А ўрачыстыя абставіны далучэння моладзі да дарослага жыцця падкрэсліваюць значнасць гэтай падзеі.**

Аб гэтым сказаў Уладзімір Андрэйчанка, вітаючы маладых людзей у Авальнай зале парламента: «Сёння вы не проста атрымліваеце пашпарты — вы атрымліваеце пуцёўку ў дарослае жыццё. Памятайце, што быць грамадзянінам — вялікая адказнасць... Дзе б вы ні былі, увесь час памятайце пра сваю Радзіму, вялікую і малую, любіце яе і ганарыцеся ёю...»

Ён падкрэсліў таксама і тое, што сёлетняе традыцыйнае свята напярэдадні Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь незвычайнае, бо праходзіць у год юбілею галоўнага закона дзяржавы. «У 1994 годзе, калі мы тут прынялі Канстытуцыю, прагаласавалі за яе, з гэтай трыбуны Прэзідэнт выступаў і даваў клятву. Ён прыняў краіну, калі ў нас на паліцах магазінаў нічога не было. Яны пустыя былі... Цяжкі час быў. І Прэзідэнт расставіў прыярытэты развіцця краіны: экспарт, каб зарабіць валюту, харчаванне, каб накарміць людзей, і жыллё. Тры прыярытэты. Прэзідэнт сказаў тады: трэба краіну адвесці ад бездані... І, дзякуючы яму, таму што Прэзідэнт сапраўды патрыёт нашай краіны, нам гэта ўдалося. А сёння ўжо гэта сучасная, незалежная дзяржава, якая сама будуе эканоміку, і яна ў нас паспяхова развіваецца. Таму яшчэ раз паўтаруся: трэба любіць сваю краіну, сваіх людзей, традыцыі і, самае галоўнае, рабіць пасільны ўнёсак у развіццё нашай дзяржавы», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Падчас размовы з падлеткамі спікер расказаў аб асаблівасцях заканатворчага працэсу, распрацоўцы законапраектаў і алгарытме прыняцця законаў. Дарэчы, Палата прадстаўнікоў сёмага склікання прыняла ўжо 364 законапраекты. Перад уручэннем пашпартоў юнакам і дзяўчатам Уладзімір Андрэйчанка адказаў на іх пытанні, якія датычыліся розных галін жыцця краіны і грамадства. Так, адзін з падлеткаў пацікавіўся, што такое — быць патрыётам. «Быць патрыётам — гэта значыць любіць усё сваё: сваю краіну, сваіх людзей, паважаць свае традыцыі, сваю гісторыю. Гэта наша краіна, і мы павінны быць патрыётамі. І перш чым даваць нейкія ацэнкі, заўсёды трэба падумаць: а што мы самі зрабілі? І трэба самім рабіць усё, каб краіна станавілася лепшай і багацейшай...» — зазначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

«Гэтая сустрэча, безумоўна, запомніцца на ўсё жыццё, — падзяліўся ўражаннямі ад сустрэчы навучэнец Віцебскага кадэцкага вучылішча Ілья Арлоў. — Атрыманне пашпарта — вельмі важная падзея. Ён для мяне як знак патрыятызму. Цяпер я сапраўдны грамадзянін сваёй дзяржавы і патрыёт. Я шчыра ганаруся нашай краінай і нашымі людзьмі — добрымі, спагадлівымі, заўсёды гатовымі прыйсці на дапамогу і падтрымаць у цяжкую хвіліну».

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

# «ЧАС СЁННЯ ТАКІ, ШТО, КАБ ЗАХАВАЦЬ СВАЕ КАШТОЎНАСЦІ, ІХ ТРЭБА ПРАПІСВАЦЬ У АСНОЎНЫМ ЗАКОНЕ»

**Размова да Дня Канстытуцыі пра саму Канстытуцыю, якой сёлета (і менавіта сёння) спаўняецца трыццаць гадоў, атрымалася, скажам так, гісторыка-філасофска-паліталагічная. З рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь доктарам гістарычных навук Вячаславам ДАНІЛОВІЧАМ мы гаварылі і як са спецыялістам, які вывучае сучасную гісторыю, і як з ідэолагам (нельга ўзначальваць такую навучальную ўстанову і ім не быць), і ўжо як з палітыкам — падчас адзінага дня галасавання яго выбралі дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, і літаральна праз тыдзень ён прыступіць да новай работы. Для ўсіх названых пасад Канстытуцыя — тэма блізкая, таму і гутарка атрымалася цікавая.**



Фота БелТА.

***— Вячаслаў Віктаравіч, з часу абвяшчэння незалежнасці Беларусі да прыняцця Канстытуцыі незалежнай краіны прайшло тры гады. Даволі доўгі час, каб краіне, якая толькі стала на самастойны шлях, жыць без Асноўнага Закона...***

— Прыняцце такога важнага для краіны дакумента, безумоўна, патрабавала часу. Асабліва калі казаць пра сітуацыю пачатку 90-х, калі многія пастулаты даводзілася прапісваць першы раз. Да таго ж быў глыбокі сацыяльна-эканамічны крызіс, палітычная нестабільнасць. Дэкларацыя аб суверэнітэце, якую БССР прыняла адной з апошніх сярод савецкіх рэспублік, атрымала статус закона, таксама фактычна стала часткай Канстытуцыі 1978 года, якая дзейнічала на той час у краіне. Так што нельга сказаць, што ў пераходны перыяд Беларусь жыла без Асноўнага Закона, але час патрабаваў распрацоўкі новай Канстытуцыі з улікам тых рэалій, якія адбываліся... Не спяшацца ў такой важнай справе, на мой погляд, было правільна. Але, як паказала практыка, усё роўна не ўсё было ўлічана і прапісана...

***— Напрыклад?..***

— Напрыклад, пасля прэзідэнцкіх выбараў стала відавочна, што не ўрэгуляваны адносіны паміж рознымі галінамі ўлады. Атрымлівалася, што на чале краіны стаіць Прэзідэнт, але яго паўнамоцтвы вельмі значна абмежаваныя парламентам. І фактычна Беларусь заставалася парламенцкай рэспублікай. Тут як гісторык лічу патрэбным заўважыць, што парламенцкі тып дэмакратыі для нас амаль заўсёды быў не вельмі ўдалы. Прынамсі, ёсць яскравыя адмоўныя прыклады. Той жа сейм Рэчы Паспалітай, у склад якой даволі працяглы час уваходзілі беларускія землі, — у ім дастаткова было аднаго голасу супраць, каб рашэнне не прымалася. Дастаткова было падкупіць ці запалохаць аднаго шляхціца, абранага на сейм, — і закон не прымаўся. Ды і досвед парламенцкай рэспублікі пачатку 90-х не самы найлепшы: абмеркаванні і спрэчкі падчас пасяджэнняў было цікава паглядзець і паслухаць, але які быў ад іх эфект? Вертыкаль улады ў рэспубліцы пасля развалу Савецкага Саюза была парушана, і яна так і не выбудавалася. Тыя рашэнні, якія прымаў Вярхоўны Савет, на месцах часта не выконваліся, бо адсутнічала гэта вертыкаль. І Аляксандр Лукашэнка, які стаў Прэзідэнтам, убачыў, што патрэбна выводзіць краіну з крызісу, а для гэтага неабходна, каб рашэнні, якія прымаюцца «наверсе», выконваліся паўсюль. Парламент не хацеў гэту вертыкаль выбудоўваць, таму што гэта абмяжоўвала б яго ўладу. А ў Канстытуцыі гэта прапісана не было, стала зразумела, што патрабуюцца карэкціроўкі. Таму, нягледзячы на тое што работа над Асноўным Законам ішла тры гады, ужо праз два з паловай гады пасля яго прыняцця адбыўся рэферэндум, па выніках якога ў Канстытуцыю былі ўнесеныя змяненні, што датычыліся менавіта размеркавання ўлады. Беларусь стала прэзідэнцкай рэспублікай. Зноў як гісторык скажу: якая б дэмакратычная краіна ні была, калі надыходзіць крызіс, заўсёды ўлада канцэнтруецца ў руках аднаго чалавека, і толькі тады з крызісу можна выйсці. Праўда, пры ўмове што гэты чалавек дбае не аб уласных інтарэсах, а аб інтарэсах краіны і народа. У нас, дзякуй богу, здарылася менавіта так.

***— Рэферэндум 1996 года быў не апошні, які датычыўся змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, былі яшчэ два — у 2004-м і 2022-м. Скептык, ведаючы гэта, заўважыць: дык якое ж тады 30-годдзе мы сёлета святкуем, калі ад рэдакцыі 1994 года ў некаторых важных для дзяржаўнага ўладкавання момантах засталося не вельмі шмат...***

— Найперш, трэба казаць пра сам факт прыняцця першай Канстытуцыі незалежнай дзяржавы. Менавіта не як рэспублікі СССР, як было прапісана ў папярэдніх Канстытуцыях (за выключэннем Канстытуцыі ССРБ 1919 года, што ўвогуле была самай першай і мела толькі асобныя прыкметы Асноўнага Закона), а як суверэннай незалежнай краіны... І заўважце, пасля ўносіліся толькі змяненні ў Канстытуцыю, і не было такога: спыніць дзеянне гэтай і прыняць новую...

***— Пры прыняцці згаданай Канстытуцыі 1919 года за ўзор была ўзятая Канстытуцыя РСФСР. Заканадаўцы 90-х таксама пачыналі не з чыстага ліста...***

— Так, несумненна. У якасці прыкладу разглядалася і французская Канстытуцыя, прызнаная вельмі дэмакратычнай, і Канстытуцыя Расійскай Федэрацыі, якая на той момант ужо была прынятая...

***— ... і Канстытуцыя ЗША. Памятаю, як у 94-м урачыста, з прыдыханнем абвяшчалі: «Наша Канстытуцыя пачынаецца, як амерыканская: «Мы, народ...»***

— Уплыў амерыканцаў быў насамрэч значна большы, чым гэты пачатак, у якім нічога дрэннага няма. Іншая справа, што менавіта «дзякуючы» заакіянскім «сябрам», якія на пачатку 90-х на постсавецкай прасторы слылі апалагетамі дэмакратыі і дабрабыту, абвешчаная імі «дэідэалагізацыя» знайшла сваё адлюстраванне і ў нашай Канстытуцыі. Але ж ніякая краіна не можа існаваць без ідэалогіі. Калі не будзе сваёй ідэалогіі — будзе чужая, іншай дзяржавы, і на гэтую дзяржаву вы і будзеце працаваць. На тое і быў разлік... Успомніце: калі пачалі ўводзіць першыя санкцыі супраць Беларусі? Пасля канстытуцыйнага рэферэндуму 96-га года, калі стала зразумела, што невялікая краіна не хоча падпарадкоўвацца сусветнаму «гаспадару», а намерваецца ісці сваім уласным шляхам. «Гаспадару» не патрэбна была моцная ўлада, якая будзе адлюстроўваць інтарэсы свайго народа, яму была патрэбная ўлада, якая будзе рабіць тое, што ёй скажуць... Памятаеце, нам менавіта тады ўкінулі тэрмін «талерантнасць», і мы з гонарам казалі пра сябе, якія мы, беларусы, талерантныя. Але ж гэты тэрмін узяты з медыцыны, і там ён азначае нездольнасць арганізма супрацьстаяць шкоднаму знешняму ўплыву. Вось такія мы былі і патрэбныя...

***— Калі казаць пра свой шлях, мы, напэўна, ім пайшлі і адносна прынцыпаў змяненняў у Канстытуцыю. Здаецца, сучасная гісторыя не ведае больш выпадкаў, каб за трыццаць год тройчы праходзіў усенародны рэферэндум, каб штосьці змяніць або дапоўніць у Асноўным Законе...***

— Прыняцце паправак у Канстытуцыю шляхам агульнага рэферэндуму — гэта самы дэмакратычны спосаб вырашэння пытання. А само ўнясенне паправак — нармальны працэс дзяржаўнага будаўніцтва. У сусветнай практыцы папраўкі ў Асноўны Закон дзесьці прымаюцца парламентам, дзесьці нейкім іншым органам улады. Але параіцца з усімі грамадзянамі і прыняць тое, за што прагаласавала большасць, адважваецца не ўсе. Нічога страшнага, што мы даволі часта падпраўляем сваю Канстытуцыю. Галоўнае, што мы робім гэта самі, у сваёй краіне, усе разам, рэагуем такім чынам на змены, якія адбываюцца ў нашым грамадстве, у свеце вакол нас...

***— Калі казаць пра канстытуцыйныя рэферэндумы... З першымі двума ўсё зразумела: папраўкі ўносіліся дзеля больш дакладнай структурызацыі дзяржаўнай улады. Рэферэндум жа 2022 года меў, калі можна так сказаць, і эмацыянальны складальнік. У тым ліку і ў змяненнях, якія былі на яго прапанаваныя. Маю на ўвазе прапісанне ў новай рэдакцыі нацыянальныя каштоўнасці, захаванне гістарычнай памяці, інстытут традыцыйнай сям'і... Увогуле, думаю, можна сказаць, што, калі б не было падзей 2020 года, не было б рэферэндуму 2022-га...***

— Бадай што варта з вамі пагадзіцца. Хоць пра неабходнасць унясення змен у Канстытуцыю, узмацненне паўнамоцтваў парламента, пераразмеркаванне прэзідэнцкіх абавязкаў кіраўнік дзяржавы гаварыў даволі даўно, пачынаючы з 2016 года. А вось што датычыцца згаданых вамі пасылаў, якія, уласна, і ёсць складальнікі той самай ідэалогіі, ад якой мы ў свой час адмовіліся... Гэта сапраўды наш адказ і на падзеі 2020 года, які паказаў нам, што можа адбыцца, калі не звяртаць увагу на, здавалася б, элементарныя рэчы, і на тое, што адбываецца ў свеце. Так, рэферэндум 2022 года сапраўды асаблівы, бо ён скіраваны на захаванне нашых традыцыйных каштоўнасцяў, а значыць, і нас саміх як народа, як краіны. Мы яшчэ раз пацвердзілі сваё жаданне жыць так, як мы самі лічым патрэбным.

***— Яшчэ нейкія трыццаць гадоў назад нават думкі ні ў кога не было, што паняцце сям'і як шлюбу паміж мужчынам і жанчынай трэба будзе ўносіць у Канстытуцыю...***

— Час сёння, на жаль, такі, што, каб захаваць свае каштоўнасці, саміх сябе, іх трэба прапісваць у Асноўным Законе. І добра, што мы зрабілі гэта своечасова, наступныя пакаленні будуць мець аснову, будуць дакладна ведаць, на чым будуецца нармальнае, здаровае ў поўным сэнсе гэтага слова грамадства.

***— І тое, што людзі прыйшлі на гэты рэферэндум, нягледзячы на шматлікія інфармацыйныя ўкіды і заклікі, — найлепшае сведчанне таго, што яны менавіта такое грамадства і хочуць будаваць.***

— Людзі адчулі і ўбачылі, як лёгка можна згубіць мір і спакой у сваёй краіне. Падзеі 2020 года падштурхнулі да гэтага разумення: можна не пайсці на рэферэндум, але гэта развяжа рукі агрэсіўнай меншасці, якая стане прымушаць жыць па сваіх (а дакладней, па чужых) законах... Змяненні, унесеныя праз рэферэндум у Канстытуцыю, страхуюць у тым ліку і ад разбуральных кардынальных перамен у палітычным жыцці краіны.

***— Вы маеце на ўвазе наданне Усебеларускаму народнаму сходу статусу найвышэйшага органа дзяржаўнай улады? Таксама, на мой погляд, унікальная з'ява ў сусветнай практыцы...***

— Гэта запатрабавана і зменамі ў беларускім грамадстве, і, асабліва тым, што адбываецца вакол у свеце. У гэтым геапалітычным шторме час, які патрэбен для пераўладкавання аднапалярнага свету (а яно абавязкова адбудзецца), трэба перажыць як мага больш бяспечна для краіны і для яе людзей, захаваўшы саміх сябе. Найвышэйшы орган, у які ўваходзяць 1200 чалавек, што прадстаўляюць і выканаўчую ўладу, і заканадаўчую, і мясцовае самакіраванне, і грамадзянскую супольнасць, — з'ява сапраўды ўнікальная. Гэта дае магчымасць найбольш эфектыўна забяспечваць баланс розных сацыяльных груп, прымаючы найважнейшыя рашэнні. Гэткі калектыўны розум усяго народа. У якой краіне, няхай яна называе сябе самай дэмакратычнай, ёсць штосьці падобнае?

***— Праз Канстытуцыю мы зрабілі сабе страхоўку?***

— Так, страхоўку ад радыкальных змен.

***— І зрабілі свой Асноўны Закон фактычна ідэальным?***

— На дадзены момант ён цалкам адпавядае сітуацыі ўнутры і вакол краіны і дае адказы на выклікі часу, задае стратэгічныя кірункі, па якіх рухацца. Але свет змяняецца вельмі хутка, таму верагоднасць таго, што пры нейкіх пэўных абставінах і рэаліях давядзецца зноў уносіць папраўкі, ёсць заўсёды. Галоўнае, каб гэта адбывалася з улікам інтарэсаў большасці народа (менавіта большасці, бо ўсім дагадзіць немагчыма) і на яго карысць.

***— А яшчэ не менш важна, каб гэты Асноўны Закон людзі як мінімум ведалі...***

— Я ўвогуле за тое, каб Канстытуцыя была ў кожнай нашай сям'і. І каб гэта было ўнутранае запатрабаванне людзей, каб яны хацелі ведаць не толькі свае правы, але і свае абавязкі. У гэтым кірунку пакрысе таксама рухаемся. Напрыклад, мы ў Акадэміі кіравання да Дня Канстытуцыі ўручаем яе студэнтам, якім споўнілася 18 гадоў. Вельмі добрая практыка, як сёлета падчас адзінага дня галасавання, дарыць Канстытуцыю тым, хто прыйшоў галасаваць упершыню. Ёсць спадзяванне, што яе не проста пастаўяць на паліцу, але і прачытаюць.

**Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Даніі мяркуюць прызываць жанчын на вайсковую службу

Урад Даніі плануе ўвесці абавязковую ваенную службу для жанчын (цяпер яна носіць добраахвотны характар). Аб гэтым паведаміла прэм'ер-міністр краіны Мэтэ Фрэдэрыксен. Яна заявіла аб планах павялічыць колькасць маладых людзей, якія праходзяць ваенную службу, пашырыўшы прызыў для жанчын і павялічыўшы час службы з 4 да 11 месяцаў для абодвух палоў. Аб гэтым паведаміла агенцтва Associated Press. Міністр абароны Даніі Троэльс Лунд Поўльсен заявіў, што новая сістэма запатрабуе ўнясення змяненняў у законы, якія, паводле яго слоў, адбудуцца ў 2025 годзе і набудуць моц у 2026-м. Акрамя таго, Данія мае намер у гэтым і наступным гадах павялічыць выдаткі на абарону з 1,4 % да 2,4 % ВУП. Паводле афіцыйных звестак, цяпер у Даніі да дзевяці тысяч прафесійных ваеннаслужачых, не лічачы 4,7 тысячы прызыўнікоў, якія праходзяць базавую падрыхтоўку.

## У Газе за чатыры месяцы забіта дзяцей больш, чым у канфліктах ва ўсім свеце за чатыры гады

Пра гэта заявіў генеральны камісар Блізкаўсходняга агенцтва ААН для дапамогі палесцінскім бежанцам і арганізацыі работ Філіп Лазарыні, паведаміла ТАСС. «Колькасць дзяцей, забітых за крыху больш як чатыры месяцы ў сектары Газа, перавышае колькасць дзяцей, забітых за чатыры гады войнаў па ўсім свеце разам узятых», — адзначаецца ў заяве Лазарыні. Ён таксама назваў сёлетнюю эскалацыю на Блізкім Усходзе «вайной супраць дзяцей». Паводле апошніх звестак, колькасць палесцінцаў, забітых з пачатку ваеннай аперацыі Ізраіля ў сектары Газа, набліжаецца да 31,2 тысячы. Адзначаецца, што большасць з іх — жанчыны і дзеці. Раней эксперты ААН канстатавалі, што маленькія дзеці прадоўжаць паміраць ад знясілення ў сектары Газа. Да эскалацыі канфлікту ад вострага недаядання цярпелі толькі 0,8 % дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў. Цяперашні паказчык знясілення сярод дзяцей ва ўзросце да двух гадоў на поўначы Газы складае 15,6 %, што сведчыць аб сур'ёзным і імклівым пагаршэнні сітуацыі.



# СВЯТА КНІГІ СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Максім Рыжанкоў зачытаў прывітанне Прэзідэнта ўдзельнікам Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і сімпозіума літаратараў, у якім адзначана, што сёння немалаважна, каб удумлівае слова пісьменніка вызначала духоўна-маральныя асновы жыцця чалавека, выхоўвала пачуццё адказнасці за лёс сваёй краіны, садзейнічала кансалідацыі грамадства перад сучаснымі пагрозамі і выклікамі.

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў:

— У нашай багатай на кніжныя традыцыі краіне кожнаму знойдзецца тая кніга, якая прыйдзецца яму па гусце, — сказаў ён. — Уражвае вялікая прысутнасць расійскіх кніжных выдавецтваў. Усяго каля паўтысячы экспанентаў прывезлі сюды самыя розныя навінкі. Навінкі, якія пашыраюць нашы ўяўленні пра гісторыю, асветніцтва, культуру.

Таксама ён дадаў, што на выстаўцы шмат кніг на гісторыка-патрыятычную тэматыку, звязаную з тэмай Вялікай Айчыннай вайны.

— Знайдзіце свае творы, знайдзіце тых аўтараў, якіх вы яшчэ не адкрылі, і вы станеце намнога багацейшымі, — падсумаваў Алесь Карлюкевіч.

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** таксама засярodзіў увагу на знакавай для краіны даце — 80-годдзі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

— Вы ведаеце, колькі ўвагі гэтай даце ўдзяляецца ў нашай краіне. На галоўным стэндзе прадстаўлены кнігі, якія былі выдадзены ў 2023 годзе і на пачатку 2024 года на гэтую тэматыку. У дзень, калі мы ўшаноўваем кнігу, хочацца адзначыць, што ў той перыяд, калі на Захадзе хтосьці ўкладвае грошы ў фарміраванне ўзброеных аб'яднанняў каля нашых граніц, на поўдні ідуць ваенныя дзеянні, мы ў Мінску адзначаем свята кнігі. Мы ўшаноўваем культуру кнігадрукавання, кнігавыдання і высокага літаратурнага слова. Напэўна, гэта



і ёсць пацвярджэнне ўдалай міралюбівай палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне пад кіраўніцтвам Прэзідэнта.

Таксама ён адзначыў розных удзельнікаў кніжнай выстаўкі-кірмашу, у тым ліку і «Адукацыйны квартал», прадстаўлены Міністэрствам адукацыі і Акадэміяй навук.

— Палова ўсіх кніг, якія выдаюцца ў краіне, прыпадае на навуковую і адукацыйную літаратуры. Усяго ж выдаецца каля 20 млн кніг за год. У гэтым плане Беларусь — лідар на еўрапейскім кантыненце і займае другое месца сярод краін СНД, — дадаў Уладзімір Пярцоў

Цэнтральным экспанентам сёлетняй выстаўкі-кірмашу стала Ісламская Рэспубліка Іран, якая ўпершыню прадставіла такі вялікі стэнд.

— Несумненна, воля дзяржаў, у тым ліку Рэспублікі Беларусь, па правядзенні падобных выставак, захаванне кніг і папулярызацыя



чытання, а таксама ўшанаванне і заахвочванне пісьменнікаў, дзеячаў навукі і культуры сведчаць аб правільным і глыбокім разуменні дзяржавай значнай ролі кнігі і чытання, пісьменнікаў, вучоных і выдаўцоў і іх уплыву на развіццё і росквіт грамадства, — адзначыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Алірэза САНЕІ**.

Падышлі мы, вядома, і да стэнда Выдавецкага дома «Звязда». У гэтым годзе на кніжнай выстаўцы-кірмашы прадстаўлены такія навінкі, як «Ведаем, ганарымся!» Ірыны Аўсеп'ян, «Буйніцкае поле: «застацца і памерці...» Мікалая Барысенкі, «Генералы сорак першага года» Мікалая Чаркашына і «Цяжкія дарогі жыцця» Мікалая Чаргінца.

Наведвальнікаў стэнда чакаюць вікторыны, падарункі і акцыі. А яшчэ штодзённая яскравая прэзентацыя кніг ад пісьменніцы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Таксама сёлета на выстаўцы-кірмашы новы аўтар «Звязды» Валянціна Драбышэўская прэзентавала дзіцячы квэст «У пошуках суперсябра К». Дзеці з задавальненнем прымалі ўдзел у гэтых актыўнасцях і ў гульнявой форме далучаліся да культуры чытання.

Варта асобна адзначыць і стэнд Кітайскай Народнай Рэспублікі, на якім прадстаўлена каля дзвюх тысяч кніг. Цікавасць да гэтай літаратуры велізарная, асабліва з захапленнем кнігі разглядаюць маладыя людзі. Супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі становіцца больш шчыльным. Так, на кніжнай выстаўцы-кірмашы плануецца падпісанне пагаднення паміж выдавецтвам «Мастацкая літаратура» і Упраўленнем Кітайскай Народнай Рэспублікі па справах выдання і распаўсюджвання літаратуры на замежных мовах.

Прыцягвае ўвагу і мабільны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які размясціўся каля выставачнага цэнтра.

— Праект называецца «Наш абавязак — памятаць!» — падзялілася **навуковы супрацоўнік музея Ксенія МАЖУЛЬ**. — Гэта шанц для людзей, якія не могуць трапіць у наш музей у Мінску, паглядзець перасоўную версію экспазіцыі. Так за 2023 год мы наведалі 27 населеных пунктаў.

Апроч гістарычнай экспазіцыі, у мабільным музеі прадстаўлены таксама і розныя выданні на ваенную тэматыку.

— Вельмі цікавыя нашы «Партызанскія рукапісныя часопісы», у якіх адлюстраваны побыт падпольшчыкаў, — адзначыла **бібліятэкар Алена СТАВІЦКАЯ**. — Усяго калекцыя музея налічвае 248 адзінак рукапісных часопісаў. Увесь матэрыял, прадстаўлены ў выданнях, размеркаваны па абласцях і маляўніча ілюстраваны. Таксама гэта калекцыя ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь (катэгорыя «1»).

Расказваць аб экспанентах і мерапрыемствах кніжнай выстаўкі-кірмашу можна бясконца. Аднак лепш наведаць яе і самастойна акунуцца ў гэты разнастайны кніжны свет, дзе кожны сапраўды знойдзе тое, што яму па душы.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

# «ТАКУЮ ПРЫГАЖОСЦЬ БАЧУ Я ЎПЕРШЫНЮ»

## Экскурсія для выхаванцаў Івянецкага дома-інтэрната прайшла ў Палацы Незалежнасці

**Гэтым разам на экскурсію ў Палац Незалежнасці — такія мерапрыемствы праводзяцца па даручэнні кіраўніка дзяржавы — запрасілі 25 выхаванцаў, выпускнікоў і падапечных Івянецкага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі фізічнага развіцця.**

У Палацы Незалежнасці дзеці былі ўпершыню. Асабліва іх уразілі маштабы аб'екта, яго інтэр'ер і залы з унікальнай гісторыяй. Па зачараваных вачах гасцей нескладана было здагадацца, што Палац ім вельмі падабаецца. Увагу 17-гадовага Пятра Адамовіча прыцягнулі не толькі вядомыя ва ўсім свеце залы Палаца, але і ўраджай цытрусавых у зімовым садзе. Інтарэс у хлопца ўзнік невыпадкова, ён ужо некалькі гадоў захапляецца садаводствам, у яго калекцыі ёсць лімоны, мандарыны і авакада.

— Гляджу, як тут усё ўстроена, каб досведу набрацца. Можа, штосьці новае пазнаю і ў сябе палепшу ўраджай, — расказаў ён. — Я шмат езджу па Беларусі, удзельнічаю у выступленнях, канцэртах, фэстах, конкурсах. Даволі часта бываю ў Мінску. Але з таго, што я бачыў за сваё жыццё, гэта — самае прыгожае. Такую прыгажосць я ўбачыў упершыню, — з такім уражаннем Пётр Адамовіч пакідаў Палац Незалежнасці.

Выхаванцы пабывалі ва ўсіх афіцыйных залах, дзе пішацца гісторыя сучаснай Беларусі, прымаюцца самыя важныя рашэнні, якія ўплываюць на лёс дзяржавы і народа, праходзяць важныя міжнародныя сустрэчы. У кожнага памяшкання сваё прызначэнне, афармленне і характар.

Пасля экскурсіі многія прызналіся, што па-іншаму будуць глядзець навіны і фота мерапрыемстваў з Палаца Незалежнасці. Экскурсанты вельмі ўдзячныя за ўнікальную магчымасць, дадзеную па рашэнні кіраўніка дзяржавы, — наведваць Палац звычайным людзям, радавым грамадзянам.

— Я гляджу шмат інтэрв'ю, навін з залаў гэтага Палаца, вельмі цікаўлюся палітычным жыццём. Але не чакаў, што ўжывую ўсё так магутна. Па тэлевізары яно не так унушальна выглядае. А ў жыцці — атмасферна, — расказаў Андрэй Клок. Ён выпускнік Івянецкага дома-інтэрната, цяпер вучыцца ў БДУФК па спецыяльнасці «рэжысура спартыўных мерапрыемстваў». А яшчэ вядзе свой канал на YouTube і плануе выкласці туды сюжэт аб наведванні Палаца Незалежнасці.

— Гэта крута — трапіць у Палац Незалежнасці! Я даўно пра гэта марыла і вельмі рада. Не кожнаму выпадае такая магчымасць, — падзялілася ўражаннямі Кацярына Захаваева, навучэнка РЦАП па паралімпійскіх і дэфлімпійскіх відах спорту (лыжныя гонкі і біятлон), выпускніца Івянецкага дома-інтэрната. Па яе словах, нават пасля заканчэння гэтай школы выпускнікі працягваюць цесна камунікаваць, падтрымліваюць адно аднаго, адчуваюць сябе калі не вялікай сям'ёй, то сапраўды ўжо адной камандай.

**Дырэктар Івянецкага дома-інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі фізічнага развіцця Алена ПЕТРАШКЕВІЧ** падзялілася, што для яе і падапечных гэта першае наведванне Палаца Незалежнасці. Безумоўна, ёсць вялікая заслуга калектыву дома-інтэрната і кіраў-



ніка гэтай установы, што хлопцы і дзяўчаты выхаваны ў духу пазітыву і патрыятызму:

— У нас створаны ўсе ўмовы, каб нашы дзеці і жылі, і атрымлівалі паўнацэнную адукацыю. Па заканчэнні вучобы па адмысловых праграмах яны атрымліваюць атэстаты, якія даюць магчымасць паступаць у каледжы, універсітэты, атрымліваць прафесію і быць паўнацэннымі грамадзянамі нашай краіны, — падкрэсліла яна. — У сваёй рабоце мы, педагогі, ставім галоўную мэту: каб дзеці любілі сваю Радзіму, бо лепшай і прыгажэйшай за нашу беларускую зямлю няма.

Не абышлося і без падарункаў — Івянецкаму дому-інтэрнату для дзяцей з асаблівасцямі фізічнага развіцця быў перададзены сертыфікат на восем камп'ютараў.

**Кацярына УРБАН,**
**фота аўтара.**

# ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 213

**Сённяшнія кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі.**

**№41**



**№ 41**

**Белыя простыя:** b2, d2, e3, g5, b6, дамка f8 (6)

**Чорныя простыя:** h2, b4, h4, a5, e5, d6, c7, e7, d8 (9)

**№ 42**

**Белыя простыя:** b2, f2, d4, c5, c7 (5)

**Чорныя простыя:** g3, h4, g5, f6, e7, g7 (6)

**№ 43**

**Белыя простыя:** b2, d2, f2, a3 (4)

**Чорныя простыя:** h2, b6, f6 (3)

**№ 44**

**Белыя простыя:** 49, 43, 32, 34, 21, 25 (6)

**Чорныя простыя:** 42, 38, 27, 30, 16, 18, 8 (7)

**№ 45**

Белыя простыя шашкі: 48, 42, 45, 34, 29, 30, 23, 24 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** 31, 21, 25, 18, 12, 13, 14, 15 (8)

Астатнія кампазіцыі складзены па правілах бразільскіх шашак.

**№ 46**

**Белыя простыя:** d2, g3, f4, g5, d6, f6 (6)

**Чорныя простыя:** b2, e3, b4, b6, h6, a7, h8 (7)

**№ 47**

**Белыя простыя:** g3, b4, f4, a5, g5, f6, g7 (7)

**Чорныя простыя:** b2, d2, e3, d4, b8, h8 (6)

**№ 48**

**Белыя простыя:** g3, b4, f4, a5, g5, f6, e7 (7)

**Чорныя простыя:** b2, d2, e3, d4, d8, h8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйгрываюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

Першынство Беларусі па шашках-64 разыгралі хлопчыкі і дзяўчынкі 2016 г. н. і маладзейшыя. У хлопчыкаў перамог Ян Пагудо (Мінск), у дзяўчынак — Ніна Ус з Гродна.

3 сакавіка адбыўся адкрыты раённы турнір па шашках-64 «Мядзел-2024» з удзелам 22 шашыстаў. Перамог Віталь Аніська (Мінск). У жаночым заліку першынствавала Леанарда Пашкевіч (Мядзел). Наступны турнір плануецца правесці ў канцы ліпеня ў дзень 800-годдзя г. Мядзела.

2-3 сакавіка ў СДЮШАР па шахматах і шашках г. Мінска прайшло адкрытае спаборніцтва па шашках-64 сярод ветэранаў фізічнай культуры і спорту. У спаборніцтвах прынялі ўдзел таксама юныя спартсмены СДЮШАР. Перамог міжнародны гросмайстар Аркадзь Плакхін, які ў нядаўнім чэмпіянаце Рэспублікі ўдзельнічаў 60-ы раз, што з'яўляецца рэкордным паказчыкам па колькасці ўдзелу ў чэмпіянатах Беларусі па рускіх шашках.

Анонс: 16 сакавіка ў РЦАП па шахматах і шашках (г. Мінск, вул. Маркса, 10) пройдзе адкрыты рэспубліканскі тэмпатурнір «Кубак РЦАП па шашках-64»(рэгістрацыя з 10:30 да 11:00). Палажэнне аб турніры — на сайце https://belarus.fmjd.org/.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 212 ад 01.03.2024.

**№ 34**

1. f6-e7 d8:f6 2. e5:g7 f8:h6 3. f4-g5 h6:d2 4. g1:c1 b8-a7 5. c1-d2 b6-a5 6. d4-c5 d6-e5 7. c5-d6 e5-d4 8. d6:b8 d4:b2 9. d2-c3 b2:d4 10. b4-c5 d4:b6 11. b8-d6+

№ 35 c3, e5, e3, d8, h8x

№ 36 1. e3-f4 g3:e5 2. g1:e3 d4:f2 3. f6:b6 h8:h4 4. e1:g3 h4:f2 5. c7-d8 a5:c7 6. d8:g3 a3-b2 7. g3-e5 b2-c1 8. e5-f4 c1:g5 9. h6:f4+

№ 37 1. 19-13 09:29 2. 36-31 37:17 3 .22:11 33:31 4. 44:04 38:27 5. 49:38 31-36 6. 04:31 36:47 7. 31-09 47:06 8. 09:39 06:44 9. 50:39+

№ 38 1. 22-17 06:22 2. 24-19 14:32 3. 27:38 25:32 4. 47:27 28:39 5. 27-43 16:36 6. 43:05+ Э. Дамброўскі з Мінска заўважыў, што калі крыху змяніць пачатковую расстаноўку, то праходзіць іншая камбінацыя. Але няма фіналу, што ў кампазіцыі не дапушчальна.

Б. 38, 39, 40, 31, 33, 34, 27, 30, 21, 22, 24, дамка 47 (12) Ч. 42, 28, 25, 16, 18, 12, 13, 10, дамкі 6, 9 (10) 1. 22-17 06:22 2. 24-19 13:44 3. 39:50 28:30 4. 47-36 42:33 5. 31-26 22:31 6. 36:38 16:27 7. 38:35+

№ 39 1. c1-d2 a3:g5 2. h4:h8 b6:b2 3. h8:a1 a5:c3 4. a1:a5+

№ 40 1. c1-d2 a3:e3 2. d4:f2 g3:e1 3. c5-b6 e1:b4 4. c7-d8 a5:c7 5. d8:f8 h4-g3 6. f8-c5 g3-h2 7. c5-g1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

**«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013» e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**


## «Звязда» — руплівым гаспадарам»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІ квартал або на І паўгоддзе 2024 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце з 15 лютага да 19 красавіка 2024 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграныя сем набораў садовых інструментаў Garvill JC-507 і суперпрыз — культыватар садовы Tomadica TOR-32TLR. Вынікі будуць апублікаваныя ў газеце да 4 мая 2024 года.



Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2024 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на ІІ квартал або на І паўгоддзе 2024 года. Пасля 30 чэрвеня 2024 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 28 ад 9 лютага 2024 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4399 ад 30.01.2024 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2024 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

на ІІ квартал або І паўгоддзе 2024 года

Хатні адрас і тэлефон ________ (індэкс) ________
(абавязкова)

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!






# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Анонс

# УРОКІ ПАМЯЦІ, МІСІЯ МАСТАЦТВА І САКРЭТЫ ВЫХАВАННЯ




**Трэніроўкі касмічных экіпажаў, у складзе якіх і нашы суайчынніцы — Марына Васілеўская і Настасся Лянкова, новы праект «Алесі», прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі, светлая місія мастацтва і сакрэты выхавання ад загадчыка дзіцячага садка — у сакавіцкім нумары часопіса.**

## УРОКІ ПАМЯЦІ

У сакавіку «Алеся» распачынае новы праект «Іх імёнамі названыя», прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З серыі публікацый чытачы даведаюцца пра мужных і адважных жанчын, якія ўнеслі свой уклад у барацьбу з фашызмам. Іх імёнамі названы вуліцы Мінска. У сакавіцкім нумары журналіст «Алесі» расказвае пра Героя Савецкага Саюза Марыю Іозаўну Мельнікайтэ і пра вуліцу яе імя.

**1.10** Маст. фільм «У порце» (16+).

## EuroSport 1

**5.00, 14.30** Снукер. (6+).
**7.00, 9.30** Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі». Мужчыны (16+).
**8.00, 10.00** Веласпорт. «Тры дні Бругe — Дэ-Панэ». Жанчыны (16+).
**8.30, 10.30, 17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету, Планіца. Мужчыны (6+).
**9.00, 11.00, 11.45** Горныя лыжы. Кубак свету, Зальбах-Хінтэрглем. Жанчыны (6+).
**13.00** Усе віды спорту (6+).
**13.15** Горныя лыжы. Кубак свету, Зальбах-Хінтэрглем. Мужчыны.
**18.45, 0.00, 1.05** Фігурнае катанне.
**20.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету, Сідней. Жанчыны: Канада — Scotland.
**23.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету, Манрэаль. Танцы на лёдзе.

## Кінакамедыя

**1.20** «Жудасная сямейка. Вясельны перапалох» (18+).
**3.05** «Як займацца любоўю па-англійску» (18+).
**4.40** «Бабро паржалаваць» (16+).
**6.40** «Малавіта» (16+).
**8.40** «Іспанская англійская» (12+).
**11.10** «Дрэнныя хлопцы-2» (18+).
**13.55** «Свінгеры» (16+).
**15.45** «Я худзею» (16+).
**17.40** «Як я стаў рускім» (16+).
**19.30** «Кілеры» (16+).
**21.15** «Які не спіць у Сіэтле».
**23.15** «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя Беларусьфільма (12+).
**9.30** «Давай пажэнімся» (12+).
**10.55** «Паглядзім» (12+).
**11.25, 17.15** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**13.05, 19.00, 1.55** «Сляпая» (16+).
**14.25, 20.00, 3.10** «Варажбітка» (16+).
**15.50, 1.00** «Знакі лёсу» (16+).
**21.00** «Мачаха» (16+).
**23.10** «Чорны лебедзь» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**6.30** Там, дзе сэрца (16+).
**9.00** Спяшайся кахаць (12+).
**11.00** Готыка (16+).
**13.00** З мяне хопіць (16+).
**15.10** Што хавае хлусня (16+).
**17.00** Беласнежка: помста гномаў (12+).
**19.00** Прыгажуня і пачвара (12+).
**21.10** Незвычайныя прыгоды Адэль (12+).
**23.10** Белфягор, прывід Луўра (12+).
**1.00** Цар скарпіёнаў (16+).
**2.30** Бібліятэкар: у пошуках кап'я лёсу (16+).
**4.00** Піраты па суседстве (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Пін-код» (6+).
**6.35** «Тры каты» (6+).
**7.15** «Смяшарыкі» (6+).
**8.05** «Петрапаліс» (16+).
**10.10** «1993» (16+).
**13.05** «ПіраМММіда» (16+).
**15.10** «Хатабыч» (16+).
**17.00, 17.55** «Скліфасоўскі» (16+).
**18.55** «На сонцы, уздоўж радоў кукурузы» (6+).
**20.35** «Экіпаж» (16+).
**23.10** «Вікінг» (16+).
**1.40** «Скрозь час» (16+).
**3.20** «Бацька» (16+).
**4.30** «Дзікія лебедзі» (6+).

## National Geographic

**6.20** Навуковыя глупствы (12+).
**6.45** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (12+).
**7.35, 8.20** Мегазлом (12+).
**9.05, 9.50, 0.40, 1.13** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (12+).
**10.35, 11.20, 19.30, 20.15, 21.00, 21.45** Ледзяная дарога (12+).
**12.05, 12.50, 22.30, 23.15** Карэнныя жыхары Аляскі (12+).
**13.35, 14.20, 15.00, 2.15, 3.00, 3.40, 4.25, 5.10** Расследаванні авіякатастроф (12+).
**15.45, 16.30** Эвакуацыя Зямлі (12+).
**17.15, 18.00, 18.45** Уварванне на Зямлю (12+).
**23.55** Злакючэнні за мяжой: злачынствы і пакаранне (16+).

## ЯСНАе

**4.05** Серыял «Развітвацца не будзем» (6+).
**5.40** Серыял «Дзяржаўная граніца. «Чырвоны пясок» (12+).
**8.05** «Ясна аб міні-футболе».
**8.35** Серыял «Снайпер: афіцэр СМЕРШ» (12+).
**10.05** Маст. фільм «Неба» (16+).
**12.15** Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (16+).
**14.00** Маст. фільм «Знахар» (12+).
**16.10** Маст. фільм «Я аб'яўляю вам вайну» (12+).
**17.40** Серыял «Пазыўны «Зграя»-2» (16+).
**19.20** Серыял «Шэф-2» (16+).
**21.00** «Час высокіх тэхналогій».
**21.25** Маст. фільм «План уцёкаў» (16+).
**23.20** Дак. фільм «Савецкія мафіі. Расстрэл Касога» (16+).
**0.05** Маст. фільм «Скіф» (18+).
**1.50** Маст. фільм «Наёмнік» (18+).
**3.40** Маст. фільм «Кома» (12+).

## Звязда

**6.00** «Аперацыя «Бярэзіна». Пастка для Скарцэні». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20** «Праверана на сабе. Жаночы погляд» (12+).
**7.35** «А-229. Сакрэтная зброя Крамля». Дак. фільм (12+).
**8.05** «Доўгія вёрсты вайны». Маст. фільм (12+).
**9.15, 20.05, 21.20** «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
**10.30, 11.25** «У чэрвені 41-га» (12+).
**12.20, 13.05** «Скачок Багамола» (12+).
**16.05, 16.50** «Калі растаў снег» (12+).
**17.35** «Рэйкавая вайна». Дак. фільм (12+).
**18.00, 18.45** «Саракапятка» (16+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**19.50** «Праверана на сабе. Жаночы погляд» (12+).
**22.30** «Рэйкавая вайна». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Радзіма» або смерць. З Надзеяй — за Францыю». Дак. фільм (12+).
**23.50** «Варшаўская мяжа. Беларусы ў Войску Польскім». Дак. фільм (12+).
**0.20** «Леон з Эльзаса. Беларускі партызан». Дак. фільм (12+).
**0.50** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**1.20** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
**1.50** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
**2.20** «Дзяржынскі супраць Пілсудскага». Дак. фільм (12+).
**3.15** «Палескі кацёл. Армія асуджаных». Дак. фільм (12+).
**3.45** «Бітва за Кобрын. Заложнікі сакрэтнага пакта». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**9.55, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Запозненая помста» (12+).**
**10.55, 0.35** «Скажынемаўчы».
**14.50, 20.45** «Фактар. BY 60+».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «След» (16+).**
**17.05, 18.40, 19.20 Меладрама «Паромшчыца. Даліна мары» (16+).**
**18.15** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**20.00** Панарама.
**22.55** Клуб рэдактараў (16+).
**0.15** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05** «Сляпая» (16+).
**10.35 Дэтэктыў «Сваe» (16+).**
**12.05** «Сакрэты» (16+).
**12.35 Серыял «Моцныя арэшкі» (16+).**
**14.05** «Дарагая, я забіў» (16+).
**15.25** «Новы дзень» (12+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** Гэта мая сям'я (12+).
**18.05** «Стаць шэфам» (16+).
**19.45** «Азбука «Уральскіх Пельменяў» (16+).
**21.10** Спартлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Драма «Імператрыца Кі» (16+).**
**23.35 Трылер «Рэпрадукцыя» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.50, 20.30, 23.40** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Чорная кошка». Маст. фільм (16+).**
**10.00, 16.30 «Клетка для канарэек». Маст. фільм (12+).**
**11.20** «Люблю і памятаю».
**12.00** «Перазвон». Дакументальны фільм (12+).
**13.00, 17.50** «Апошні дзень».
**13.40, 18.25 «Ціхі Дон». Маст. фільм (12+).**
**15.40** «Наперад у мінулае».
**16.05** «Сіла веры».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Яшчэ гарыць Хатынь».
**23.15** «Выпрабаванні». Дакументальны фільм.
**23.50** «Асобы».

## Беларусь 5

**6.55, 11.50** Хакей. КХЛ.
**8.55** Скрозь церні да зорак.
**9.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель».
**11.20** Хакей для ўсіх.
**13.45** Спартыўная цікавасць.
**14.25** Футбол. Кваліфікацыя да ЕЎРА-2025. Беларусь — Грэцыя.
**16.30** VeloLove.
**16.50** Хакей. КХЛ. У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Металург» (Жлобін). / Хакей. КХЛ. У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**21.50** Авертайм.
**22.20** Футбол. Кваліфікацыя да ЕЎРА-2025. Беларусь — Грэцыя.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Перазвон». Дакументальны фільм (16+).
**12.10, 13.15 Фільм «Іншы бераг» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** «Народны ДАСТ» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Лаўроў. За гранню» (16+).
**21.30 Фільм «Доктар Шчасце» (16+).**
**23.35 Фільм «Жэмчугі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект «Абскарджанню не падлягае» (16+).
**10.40** «Перазвон». Дак. фільм (12+).
**11.10** «Ідзі і глядзі» (16+).
**13.50, 0.50 «Высокія стаўкі». Серыял (16+).**
**16.50 «Куба. Асабістая справа». Серыял (16+).**
**18.40** «У пошуках ісціны. Небяспечны гардэроб».
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**20.40** «Ствараем разам».
**20.40 «Шэф». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**5.00, 3.30** Мультфільмы (6+).
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15** «Не Фантастыка» (12+).
**6.30** «Улюбёныя акцёры 2.0» (16+).
**6.55 Маст. фільм «Амерыканская дачка» (16+).**
**8.45, 10.10 Тэлесерыял «Слава» (12+).**
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**19.30 Маст. фільм «Танцуй, танцуй» (16+).**
**22.25 Маст. фільм «Кахаць па-руску» (16+).**
**0.05 Маст. фільм «Кахаць па-руску-2» (16+).**
**1.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Тэлесерыял «Таямніцы следства» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40 Серыял «Маровава» (16+).**
**18.40** Гумарыстычная праграма.
**18.55** «Прамы эфір» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Вучылка» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.25, 13.20, 22.45, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** Гісторыі выратавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «НЗ.by».
**8.55, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.30** «Без тэрміну даўнасці». Хранікальна-дакументальны тэлефільм АТН (12+).
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.45 Драма «Ідзі і глядзі» (16+).**
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.50, 22.50, 23.55 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Мора і горы» (16+).**
**21.25** «НЗ.by: час вынікаў».

## 8 канал

**7.00** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Крымінальная гісторыя» (16+).**
**8.45 Фэнтэзі, камедыя «Шазам. Лютасць багоў» (16+).**
**10.50 Серыял «Лейтэнант Каломба» (16+).**
**12.25** «Рэтраспектыва».
**14.15** «Рэтра-дэтэктыў».
**16.00 Меладрама «Водар кахання» (16+).**
**17.35, 19.15** «Надвор'е» + «Эра».
**17.40** «Вострасюжэтны баявік».
**19.20** «Вячэрні серыял».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.00** «Надвор'е».
**21.05** «Урокі Лазуркіна».
**21.10 Баявік «Эксперымент «Ведзьма» (16+).**
**23.20** «Начны серыял».



## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05, 15.20** Прыступкі цывілізацыі.
**8.00** Неўскі каўчэг. Тэорыя немагчымага.
**8.30** «Жыццё і лёс».
**8.50** «Талант». Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 17.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.00** XX стагоддзе.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** «Калекцыя гісторый». Дак. серыял.
**13.30, 13.50, 14.10, 0.00, 0.20, 0.40** «Порус». Тэлесерыял.
**14.35** Штучны адбор.
**16.15** «Белая студыя».
**17.15** «Біблейскі сюжэт».
**17.45, 2.15** Шэдэўры камерна-інструментальнай музыкі.
**18.35** «Дзмітрый Блахінцаў. Чалавек эпохі». Дак. фільм.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.50** «Абсалютны слых».
**21.30** Улада факту.
**22.15** «Каралёк — птушка пеўчая». Тэлесерыял.
**23.15** «Спачатку была справа, або Гісторыя рускай прамысловасці». Дак. цыкл.

## Настальгія

**6.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**6.40, 8.35, 9.40, 11.30, 12.50, 15.40, 17.30, 21.40, 23.30, 1.35, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.00** Маст. фільм «Лёгка кахаць» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**13.10** Маст. фільм «У порце» (16+).
**18.00** Фільм-канцэрт «Калі лёс пастаўлены на карту» (16+).
**19.35** Маст. фільм «Даліна фараонаў» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Дзіўная місіс Халідэй» (16+).
**1.50** «Мы Вас любім!» (16+)

## EuroSport 1

**3.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету, Вікерсунд. Жанчыны (6+).
**4.00, 13.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету, Фалун. Жанчыны (6+).
**4.30, 14.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету, Фалун. Мужчыны (6+).
**5.00, 8.30, 9.30, 14.30, 22.45** Снукер. (6+).
**7.00** Горныя лыжы. Кубак свету, Зальбах-Хінтэрглем. Жанчыны (6+).
**7.45, 18.30** Горныя лыжы. Кубак свету, Зальбах-Хінтэрглем. Мужчыны (6+).
**12.30** Сёрфінг (6+).
**17.30** Біятлон (6+).
**18.00** Горныя лыжы (6+).
**19.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету, Манрэаль. Пары.
**0.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету, Манрэаль. Жанчыны.

## Кінакамедыя

**0.00** «Бабро паржалаваць» (16+).
**2.05** «Хлопчык у дзяўчынцы» (16+).
**4.00** «Ас з асаў» (16+).
**5.55** «Самы Новы год!» (16+)
**7.25** «Вялікі салдат» (16+).
**9.10** «Малавіта» (16+).
**11.10** «Свінгеры» (16+).
**13.00** «Жудасная сямейка. Вясельны перапалох» (18+).
**14.50** «Дрэнныя хлопцы-2» (18+).
**17.40** «Як займацца любоўю па-англійску» (18+).
**19.30** «Змёрзлая з Маямі» (16+).
**21.15** «Родныя» (18+).
**23.05** «Іспанская англійская» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя Беларусьфільма (12+).
**9.15** «Містычныя гісторыі» (16+).
**10.10, 16.00** «Чытальнік» (16+).
**11.15** «Глядзі сам» (16+).
**11.35, 17.05** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**13.15, 18.50, 3.15** «Сляпая» (16+).
**14.35, 20.10, 3.45** «Варажбітка» (16+).
**21.35** «Правінцыйны дэтэктыў» (16+).
**23.20** «Невядомы» (16+).
**0.10** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.05** «Гульні розуму» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.45** Піяніст (16+).
**8.20** Клуб аматараў кніг і пірагоў з бульбяных ачысткаў (16+).
**10.45** Жонка наглядчыка заапарка (16+).
**13.10** Забытае (16+).
**15.00** Чалавек-матылёк (16+).
**17.15** Даспехі Бога (16+).
**19.00** Даспехі Бога-2: аперацыя «Кондар» (16+).
**21.10** Даспехі Бога-3: місія «Задыяк» (12+).
**23.30** Даспехі Бога: у пошуках скарбаў (16+).
**1.30** З мяне хопіць (16+).
**3.20** Готыка (16+).
**4.55** Што хавае хлусня (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Пін-код» (6+).
**6.35** «Тры каты» (6+).
**7.10** «Смяшарыкі» (6+).
**8.00** «Скрозь час» (16+).
**9.55** «Каханне і монстры» (16+).
**11.35** «Хэпі-энд» (12+).
**13.30** «Бацька» (16+).
**15.00** «Пара з будучыні» (16+).
**17.00, 17.55** «Скліфасоўскі» (16+).
**18.55** «Без мяне» (16+).
**20.40** «Шматпавярховік» (16+).
**22.25** «Я іду шукаць» (16+).
**0.05** «Булкі» (16+).
**1.50** «Экіпаж» (16+).
**4.00** «Правадыр разнаскурых» (16+).

## National Geographic

**6.10** Навуковыя глупствы (12+).
**6.30** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (12+).
**7.20, 8.10** Мегазлом (12+).
**8.55, 0.45** Асушыць акіян (12+).
**9.45, 1.35** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (12+).
**10.30, 11.15, 12.00, 12.45, 17.10, 17.55, 18.45, 19.30, 20.15** Аўта-SOS (12+).
**13.35, 14.15, 15.00, 22.30, 2.20, 3.05, 3.50, 4.30, 5.15** Расследаванні авіякатастроф (12+).
**15.45, 16.30** Самыя лепшыя суперкары (12+).
**21.00, 21.45** Унутры аэрапорта Сіднэй (12+).
**23.15, 0.00** Злаключэнні за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).

## ЯСНАе

**4.15** Серыял «Ялта 45» (12+).
**5.55** Серыял «Дзяржаўная граніца. «Мірнае лета 21-га года» (12+).
**8.10** «Раніца ЯСНАЯ».
**9.15** Серыял «Снайпер: апошні стрэл» (12+).
**10.50** Серыял «Аперацыя «Гаргона» (16+).
**12.25** Серыял «Пяць хвілін цішыні. Новыя гарызонты» (16+).
**14.10** Маст. фільм «Я — лялька» (16+).
**15.55** Серыял «Стылет-2» (16+).
**17.45** Серыял «Пазыўны «Зграя»-2» (16+).
**19.25** Серыял «Шэф-2» (16+).
**21.00** «Чалавек і здароўе».
**21.20** Маст. фільм «Лета 1941 года» (16+).
**23.15** Маст. фільм «Глыбокая плынь» (12+).
**0.50** Маст. фільм «Справа для сапраўдных мужчын» (12+).
**2.00** Маст. фільм «Чаклун і Румба» (12+).
**3.25** Серыял «Полымя пад попелам» (12+).

## ЗВЯЗДА

**6.00** «Маленькія салдаты вялікай вайны». Дак. фільм (12+).
**6.30** «Ад Рузвельта — Сталіну. Беларусы ў справе на мільярд». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20** «Рубікон»: хроніка надзвычайных здарэнняў.
**7.30** «Георгій Жукаў. Капкан для камкора». Дак. фільм (12+).
**8.00, 13.40** «Доўгія вёрсты вайны». Маст. фільм (12+).
**9.20, 21.25** «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
**10.30, 11.15** «Крапавы берэт» (12+).
**12.00, 12.50** «Апошні рубеж» (16+).
**14.50, 15.35** «Калі растаў снег» (12+).
**16.20** «Аперацыя «Сувораў». Кошт вызвалення». Дак. фільм (12+).
**16.50, 1.15** «Друкаваны фронт. Газеты стралялі ва ўпор». Дак. фільм (12+).
**17.20, 22.40** «Паміж мірам і вайной. Танкавае брацтва». Дак. фільм (12+).
**17.40, 18.35** «У чэрвені 41-га» (16+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**19.50, 20.40** «Скачок Багамола» (12+).
**23.20** «Партызанская мяжа». Дак. фільм (12+).
**0.15** «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д». Дак. фільм (12+).
**0.45** «Дзеці Камінтэрна. Выратаваныя ў Беларусі». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Ілья Мурамец». Перарваны палёт». Дак. фільм (12+).
**2.15** «Ваеннапалонныя. Вінаватыя, калі выжылі». Дак. фільм (12+).
**2.45** «Фаня Алер. Вайна без антракту». Дак. фільм (12+).
**3.40** «Георгій Жукаў. Ад рэкорду да парада». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.40** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.00, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Няма жыцця без цябе» (16+).**
**10.55** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 22.20 Серыял «След» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка.
**18.30, 19.20 Меладрама «Паромшчыца. Даліна мары» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Беларуская суперижанчына.
**21.55** Адзін дзень (12+).
**0.20** Сфера інтарэсаў.
**0.55** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 18.05** «Сляпая» (16+).
**10.35, 18.35 Дэтэктыў «Свае» (16+).**
**12.05** Я з вёскі (12+).
**12.35, 22.50 Серыял «Моцныя арэшкі» (16+).**
**14.05** «Сакрэты» (16+).
**14.35** «Аб здароўі: жартам і сур'ёзна» (16+).
**15.05** «Разумны дом» (12+).
**15.45** Мультсерыял «Кацяня Шмяк» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «100 месцаў, дзе паесці» (16+).
**17.45** «Карысная праграма» (16+).
**20.10 Серыял «Ніна» (16+).**
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Галя, у нас адмена!» (16+)**
**0.25 Дэтэктыў «Следчая-4» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.10** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.40, 20.30, 23.30** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Чорная кошка». Маст. фільм (16+).**
**9.55, 15.45 «Трыццаць тры». Маст. фільм (12+).**
**11.15** «Люблю і памятаю».
**11.55** «Архітэктура Беларусі».
**12.50, 17.55** «Апошні дзень».
**13.25, 18.35 «Ціхі Дон». Маст. фільм (12+).**
**15.20** «Наперад у мінулае».
**17.05** «Кадры жыцця».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.45** «Ім не было і шаснаццаці».
**23.05** «Звініце, цымбалы!» Фільм-канцэрт.
**23.40** «Асобы».

## Беларусь 5

**6.55, 16.50, 21.50** Хакей. КХЛ.
**8.55** Агнявы рубеж.
**9.25** Баскетбол. БК «Ніжні Ноўгарад» — БК «Мінск».
**11.10** Слэм-данк.
**11.40** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Юнацтва-Мінск».
**13.35** Між іншым.
**13.55** Фігурнае катанне. Адкрыты Кубак Беларусі.
**15.50** Як гэта было.
**16.20** Хакей для ўсіх.
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель». / Хакей. КХЛ. Плэй-оф. У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**23.45** Скрозь церні да зорак.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
**11.25 Фільм «Палавінкі немагчымага» (12+).**
**12.30, 13.15 Фільм «Дама трэф» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**20.00, 1.35** Час.
**21.20 «Перавядзі яе праз Майдан». Фільм (16+).**
**22.30 Фільм «Жэмчугі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект «Закрыты архіў» (16+).
**10.40** Дак. праект «Без падману» (16+).
**13.50, 0.50 «Высокія стаўкі». Серыял (16+).**
**17.00 «Куба. Асабістая справа». Серыял (16+).**
**19.00** «Са знакам якасці».
**20.15, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**20.40** «Беларуская супержанчына».
**20.50 «Рэалізацыя». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**2.25, 5.00 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**4.40, 5.05** Мультфільмы (6+).
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15** «Пяць прычын паехаць у ...» (12+)
**6.25, 23.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**7.15 Маст. фільм «Мэры Попінс, да пабачэння».**
**10.10 Маст. фільм «Танцуй, танцуй» (16+).**
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**22.20 Маст. фільм «Моцны арэшак» (16+).**
**0.55 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Тэлесерыял «Таямніцы следства» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Так! Але...»
**12.20** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.00** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40 Серыял «Марозава» (16+).**
**18.40** Гумарыстычная праграма.
**18.55** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Тэлесерыял «Ганна медыюм» (16+).**
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.20, 13.20, 22.35, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** Гісторыі выратавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.20** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.10** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.30, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.40 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Мора і горы» (12+).**
**22.40, 23.55 Дэтэктыў «Прэтарыянец» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 21.20** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Крымінальная гісторыя» (16+).**
**8.35** «Дакументальны экран».
**9.00 Серыял «Крымінальная гісторыя» (16+).**
**10.00 Камедыя «Стой, ці мая мама будзе страляць» (16+).**
**11.30 Серыял «Лейтэнант Каломба» (16+).**
**13.10** «Рэтраспектыва».
**14.35** «Рэтра-дэтэктыў».
**16.15 Меладрама «Водар кахання» (16+).**
**17.45, 19.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**17.50** «Вострасюжэтны баявік».
**19.25** «Вячэрні серыял».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Асалам алейкум, Беларусь!»
**21.15** «Урокі Лазуркіна».
**21.25 Дэтэктыў «Кантрыбуцыя» (16+).**
**0.05** «Начны серыял».





## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05, 15.20** Прыступкі цывілізацыі.
**8.00** Неўскі каўчэг. Тэорыя немагчымага.
**8.30** «Жыццё і лёс».
**8.50** «Талант». Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 17.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.00** XX стагоддзе.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** «Калекцыя гісторый». Дак. серыял.
**13.30, 13.50, 14.10, 0.00, 0.20, 0.40** «Порус». Тэлесерыял.
**14.35** «Абсалютны слых».
**16.15** «2 Вернік 2».
**17.15** Пернікавы домік.
**17.45, 2.15** Шэдэўры камерна-інструментальнай музыкі.
**18.45** Астравы.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.50** «У чацвер і больш ніколі». Прытча аб страчаным рai». Аўтарскі фільм.
**21.30** «Энігма. Аляксандра Арыёзі».
**22.15** «Каралёк — птушка пеўчая». Тэлесерыял.
**23.15** «Спачатку была справа, або гісторыя рускай прамысловасці». Дак. цыкл.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**6.50, 9.40, 11.30, 15.40, 17.30, 18.35, 20.40, 21.40, 23.45, 0.40, 2.35, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.10** Маст. фільм «У порце» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** Фільм-канцэрт «Калі лёс пастаўлены на карту» (16+).
**13.35** Маст. фільм «Далі на фараонаў» (16+).
**18.00, 0.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**19.10** Маст. фільм «Тэрыторыя Каларада» (16+).
**1.00** Маст. фільм «Лёгка кахаць» (16+).

## EuroSport 1

**5.00, 8.30, 9.30, 14.30, 0.05** Снукер. (6+).
**7.00** Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі». Мужчыны (16+).
**8.00** Веласпорт. «Тры дні Бруге — Дэ-Панэ». Мужчыны (16+).
**12.30** Горныя лыжы. Кубак свету, Зальбах-Хінтэрглем. Жанчыны (6+).
**13.15** Горныя лыжы. Кубак свету, Зальбах-Хінтэрглем. Мужчыны (6+).
**14.00** Гольф (6+).
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна (6+).
**18.10, 1.00** Фігурнае катанне.
**20.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету, Сіднэй. Жанчыны: Турцыя — Scotland.
**23.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету, Манрэаль. Мужчыны.

## Кінакамедыя

**1.30** «Наша Russia. Яйкі лёсу» (18+).
**3.00** «Шэф пад прыкрыццём» (18+).
**4.25** «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі» (12+).
**6.15** «У спорце толькі дзяўчаты» (16+).
**8.00** «Хлопчык у дзяўчынцы» (16+).
**9.45** «Булкі» (16+).
**11.40** «Дрэнныя хлопцы» (16+).
**13.55** «Шпіён па суседстве» (12+).
**15.40** «Змёрзлая з Маямі» (16+).
**17.25** «Красуня на ўсю галаву» (16+).
**19.30** «Я худзею» (16+).
**21.25** «Выратуйце Калю!» (12+)
**23.15** «Пацучыныя скачкі» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя Беларусьфільма (12+).
**9.45, 16.25** «Містычныя гісторыі» (16+).
**11.25** «Паглядзім» (12+).
**11.55, 17.20** «Выдатнае стагоддзе» (16+).
**13.40, 19.10** «Сляпая» (16+).
**15.00, 20.30, 4.00** «Варажбітка» (16+).
**21.55** «Правінцыйны дэтэктыў» (16+).
**23.40** «Невядомы» (16+).
**0.35** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.30** «Гладыятар» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**6.30, 3.05** Доні Дарко (16+).
**8.50, 1.30** «2:22» (16+).
**10.45** Даспехі Бога (16+).
**12.30** Даспехі Бога-2: аперацыя «Кондар» (16+).
**14.35** Даспехі Бога-3: місія «Задыяк» (12+).
**17.00** Даспехі Бога: у пошуках скарбаў (16+).
**19.00** Спяшайся кахаць (12+).
**21.00** Там, дзе сэрца (16+).
**23.20** Веру ў каханне (12+).
**4.50** Забытае (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Пін-код» (6+).
**6.35** «Тры каты» (6+).
**7.10** «Смяшарыкі» (6+).
**8.00** «Без мяне» (16+).
**9.40** «Блакбастар» (16+).
**11.15** «Шматпавярховік» (16+).
**13.05** «Скрозь час» (16+).
**15.00** «Булкі» (16+).
**17.00, 18.00** «Скліфасоўскі» (18+).
**18.55** «1993» (16+).
**21.50** «ПіраМММіда» (16+).
**23.55** «Петрапаліс» (16+).
**1.55** «Праўдзівыя разнаскурых» (16+).

**3.20** «Хатабыч» (16+).
**4.50** «Пунсовая кветачка» (6+).

## National Geographic

**6.20, 5.15** Навуковыя глупствы (12+).
**6.45** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (12+).
**7.30, 8.20** Мегазлом (12+).
**9.05, 0.45** Асушыць акіян (12+).
**9.55, 1.35** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (12+).
**10.40, 11.25, 12.10, 12.55** Амерыканская мафія знутры (16+).
**13.40, 14.25, 15.10, 19.35, 20.15, 2.20, 3.05, 3.50, 4.35** Расследаванні авіякатастроф (12+).
**15.50, 16.35** Служба бяспекі аэрапорта: Рым (12+).
**17.20** Служба бяспекі аэрапорта: Перу (16+).
**21.00, 21.45, 22.30** Памежная ахова Іспаніі (12+).
**23.15, 0.00** Зляключэнні за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).

## ЯСНАе

**4.55** Серыял «Развітваццa не будзем» (6+).
**6.30** Серыял «Дзяржаўная граніца. «Усходні рубеж» (12+).
**9.00** «Ясна аб футболе».
**9.35** Серыял «Снайпер: апошні стрэл» (12+).
**11.05** Серыял «Аперацыя «Гаргона» (16+).
**12.40** Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (16+).
**14.25** Маст. фільм «07-ы мяняе курс» (12+).
**16.00** Серыял «Стылет-2» (16+).
**17.50** Серыял «Пазыўны «Зграя»-2» (16+).
**19.25** Серыял «Шэф-2» (16+).
**21.00** «У адкрытым доступе».
**21.30** Маст. фільм «Бабло» (16+).
**23.05** Серыял «Танкіст» (12+).
**0.50** Маст. фільм «Зграя» (12+).
**2.30** Серыял «Полымя пад попелам» (12+).

## ЗВЯЗДА

**6.00** «Партызанская мяжа». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 1.15** «Крылы Савецтаў. Агонь у адказ». Дак. фільм (12+).
**7.50, 13.40** «Доўгія вёрсты вайны». Маст. фільм (12+).
**9.00, 21.25** «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
**10.15, 11.10, 17.40, 18.35** «У чэрвені 41-га» (12+).
**12.05, 12.55, 19.50, 20.35** «Скачок Багамола» (12+).
**14.50, 15.35** «Калі растаў снег» (12+).
**16.20** «Рэпартаж з фронту». Дак. фільм (12+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**22.40** «Паміж мірам і вайной. Разведка боем». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Георгій Жукаў. Ад рэкорду да парада». Дак. фільм (12+).
**23.50** «Аперацыя «Сувораў». Кошт вызвалення». Дак. фільм (12+).
**0.20** «Дзяржынскі супраць Пілсудскага». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**2.40** «Леон з Эльзаса. Беларускі партызан». Дак. фільм (12+).
**3.10** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**3.40** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## НУМАР З БОТАМ НЕ ПРАЙШОЎ... ПАКУЛЬ

...Некалі і нейкае вучылішча Стасік, казалі, скончыў, прафесію меў, але ж толкам нідзе не працаваў, бо яго не цанілі. І хутчэй за ўсё, мелі рацыю, бо — мамчын сынок, а калі папросту, дык гультай звычайны: справу, з якой нармальны мужчына справіцца за дваццаць хвілін, Стасік расцягвае на паўдня! А цэлы дзень — нават з ноччу — ён хіба тэлевізар мог глядзець... Прывык: мама яму дазваляла. Рана аўдавеўшы, яна працавала цялятніцай, добра зараблярала, разам з любімым сынком яны трымалі коз, парасят, курэй і нядрэнна жылі. (Стасік, трэба сказаць, таксама зарабляў, хоць і зрэдку — чысціў некаму коміны, рамантаваў платы, абкошваў межы ды падворкі...

Пасля смерці матулі на іх падворку жыўнасць неяк хутка звялася. Стасік перасварыўся з сёстрамі, якія ўсё ж прыязджалі, каб пасадзіць агарод, папалоць ды прыбрацца ў хаце... А заадно — «папілаваць»: шукай работу, гультай! Жаніся!

З першым яму і праўда пашчасціла — узялі начным дырэктарам (вартаўніком — з дзяжурствам суткі праз суткі). А вось з жаніцьбай... Гэта ўжо асобная гісторыя.

...У мястэчку, вёрст за восем ад Стасіка, жыла Галіна — жанчына энергічная, працавітая, рашучая. Гадоў колькі таму яна развялася з мужам і цяпер усім даводзіла, што калі яшчэ раз адважыцца на шлюб, то выключна з непітушчым! І — само сабой — нежанатым... У акрузе з такіх толькі Стасік і быў, бо сапраўды не выпіваў. Спачатку мама не дазваляла, а потым і сам...

У Галі ён, здаралася, працаваў: некалі навешваў новыя дзверы ў склепе (два дні шчыраваў), рамантаваў цяпліцу (упраўся за чатыры)... Тады ж і на гаспадыню вока паклаў. «Не губляйся, дзяцюк, дзействуй, — падахвоціў Стаса Галін сусед дзед Міхал. — Выгарыць — як нагу ў цёплы бот уставіў!»

Ну хто б не хацеў — з гумовіка?!

І Стасік стараўся, «дзействаваў»: клікала не клікала — раз на тыдзень імчаў да Галі, каб нешта зрабіць, а ўрэшце — разам адзначыць жаночае свята.

...Тут неабходна заўважыць, што трэцяй адметнасцю (пасля цвярозасці і ляноты) у Стасіка была скнапасць. «Гэта ж трэба падарунак!» — уголас падумаў ён. «Так-так, без падмазкі і блін не адстае, — згадзіўся з ім дзед Міхал. — Кветкі, сувенір, шампанскае — гэта як мінімум».

Кавалер мусіў пайсці па крамах.

Ад цэн у першай, у кветкавай, яго ледзь не разбіў інсульт!.. На шчасце, у куточку заўважыў тры чырвоныя гваздзікі, што схілілі галоўкі перад хуткім скананнем. Стасіка гэта не збянтэжыла: ён купіў.

У шапіку з сувенірамі да яго адразу ж «падкацілася» вопытная прадавачка і з першай спробы «ўпарыла» шчодра пакрытую пылам дэкаратыўную свечку з прылепленым збоку амурчыкам.

Шампанскае наш «залётнік» вырашыў не купляць — дома была бутэлька «Бульбаша». (Аб тым, што дарыць жанчынам гарэлку, — гэта маветон, па тэлевізары чамусьці не сказалі.)

...Раніцай 8 Сакавіка ён, паголены і прыбраны, ужо садзіўся на ровар. Бутэлька была за пазухай, свечка — у пакеце на рулі, кветкі — у руцэ. І ўсё б нічога, але дарога — у лужынах, а яны — пакрыты лядком... Бразнуўся Стасік! Сам амаль не пабіўся. Бутэлька ацалела. Гваздзічок зламаўся. І ад свечкі адваліўся амурчык.

**Як** гэты, можна сказаць, пахавальны прэзент (у выглядзе дзвюх кветак, свечкі і пляшкі на памін) падзейнічаў на імпульсіўную жанчыну, здагадаецца, мусіць, няцяжка?.. Ды і сведка быў: мясцовы п'янтос па мянушцы Паўтарачка. Ён міма якраз праходзіў і ажно прысеў, калі над галавой прасвістала злашчасная свечка, праляцелі гваздзікі і пад нагамі ў яго разбілася бутэлька саракаградуснай... Следам — з ботамі пад пахай — выскачыў Стасік.

...Патрэбна мараль? Ды калі ласка: дарагія мужчыны, не шкадуйце грошай на жанчын. Ну хоць бы раз у год — на 8 Сакавіка.

**А. Несцяронак,**
*г. Докшыцы.*

## З ПРЫБЫТКУ ГАЛАВА НЕ БАЛІЦЬ?

Пра людзей з нашага мястэчка некалі праўду казалі: «Шаўцы, краўцы — петрыкаўцы». Вельмі шмат было майстравых: адны болей кліентаў мелі, другія меней, у некага вадзілася капейка, у некага...

Грыша Карабейка (ён жа мясцовы Несцерка) быў з апошніх. І не таму, што няўмека ці Карабейчыха (жонка яго) няўдаліца — сям'я дужа вялікая: дзяцей — можа, з дзясятак? Каб пракарміцца, яны карову трымалі (што ўжо казаць пра свіней ды курэй), мелі каня, абраблялі зямлю... І моду завялі на кожнае вялікае свята дзяцей у госці адпраўляць: усіх — разам з бацькам.

Грыша на гэта з ахвотай згаджаўся, бо гасцяваць — яно ж не пні карчаваць, нават не боты шыць... Можна чарку выпіць, смачна пад'есці (палешукі ж да свят годна рыхтаваліся!), пагаманіць, парадавацца, што дзеці сытыя ды вясёлыя.

Але ж праўду кажуць, што чужая яечня не вечна: дзень-другі-трэці (ну пяты!) і нават родны цесць, пасадзіўшы гасцей за стол, прапануе выпіць «аглаблёвую» — чарку на дарожку, пасля якой дзеці — на вуліцу і ў сані ці на калёсы.

Вось і ў той раз нехта з малых туды сам залез, некага падсадзілі... Грыша ўзяў лейцы, конь, які добра ведаў дарогу, крануўся з месца — паехалі.

...Дома іх сустрэла гаспадыня: прывеціла малых, абняла-прытуліла, стала распытваць, як жа ім было ў гасцях, і тым часам прыкмячае нядобрае:

— Грыша, а ты колькі дзяцей прывёз? — пытае ў мужа.

— Як гэта колькі?! — пужаецца бацька (няўжо кагосьці згубіў ці забыўся?!). — Усіх, што на возе былі.

— Але ж тут — двое чужых.

— Дык з прыбытку галава не баліць! — весялее бацька. — Чужых дзяцей не бывае!

Гаворыць так сваёй Карабейчысе ды заўважае, што на двор да іх шыбуе заклапочаны вясковец (Грыша ці не кожную зіму жыў у яго сям'і — абутак правіў ды шыў... І цяпер во, па дарозе дамоў, таксама спыняўся).

— Браток, ці не звёз ты маіх хлапчукоў? — пытаецца госць. — Як скрозь зямлю праваліліся — нідзе няма!

— Ды ў нас яны, у хаце! — супакоіла чалавека Грышкава жонка.

А малыя ўжо і самі выскачылі насустрач, залапаталі, што хацелі толькі трохі на кані пад'ехаць — да канца вёскі, а ўзялі ды прыехалі ў Петрыкаў.

— Ну добра, яны малыя, дурныя, — стаў даводзіць Грышу іх бацька. — А ты ж — чалавек дарослы. Няўжо не адрозніў сваіх дзяцей ад маіх?

— Не, — паціснуў плячыма п'янаваты Грышка. — Ды ты сам паглядзі — усе на адзін капыл!

Госць з недаверам паглядзеў на ватагу дзяцей, на шаўца:

— Сволач ты, Грышка! — сказаў з дакорам, забраў хлапчукоў і рушыў з двара. Грышка хацеў запыніць яго, апраўдацца, але не паспеў, бо жонка яго (баба досыць раўнівая) ужо схапіла пугаўё:

— Дык што, —— малоцячы ім па спіне, перапытвала Грышу, — усе дзеці твае? Чужых не бывае?! Бабнік! Валацуга! Я ж табе пакажу!

Грыша, не першы год жанаты, ведаў, што трэба «глядзець», бо пад гарачую руку жонка нічога не пачуе... А таму, ратуючы галаву, пусціўся наўцёкі.

Пра тое, што ні ў чым не вінаваты — і ён, і таму вяскоўцу — шматдзетны бацька збіраўся даводзіць заўтра.

**Н. А. Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

## ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, але і свой розум май

Апошнім часам у многія вясковыя дамы, у хаты падводзіцца газ, у многія — электрычнае ацяпленне, што, вядома, зручна: пахадала на дварэ — кацёл уключыў і ніякіх турбот. А раней жа трэба было дроў: нарыхтаваць, прывезці...

Якраз у тыя гады некалькі мужчын-суседзяў надумалі зрабіць гэта разам: талакою пайсці ў лес, спілаваць дрэвы, якія пазначыў ляснік, парэзаць, сцягаць ды зласкыць у штабелі, прыбраць ламачча. Работы шмат, але ж і рук нямала, прычым дужых, мужчынскіх, — у кампаніі толькі адзін падлетак. Ён, Антон, у горадзе гадаваўся — у вёску, да бабулі з дзедам, хіба на канікулы калі прыязджаў — стараўся дапамагчы. Вось і цяпер з ахвотай збіраўся на талаку, дзе на яго няшчасце — быў дзядзька Янка, якога, што называецца, хлебам не кармі — дай некага зачапіць, падманьць, разыграць...

На гэты раз ён таксама не вытрываў — сказаў Антону, што ў лес, апроч падмацунка ды сякеры, трэба лямпу паяльную ўзяць. На марозе, маўляў, дрэвы настываюць, іх, такія, пакуль спілуеш, сем патоў пральеш! А вось калі месцы спілаў папярэдне прагрэць, дрэва ледзь не само ўпадзе.

Лямпу ў дзядулі Антон выпрасіў (дзед, праўда, не сцяміў, навошта?), у лес у торбе прынёс. І ўжо там, на месцы, выбраў самую тоўстую сушку-сасну — падступіў да яе з паяльнай лямпай.

Мужчыны, заглушыўшы бензапілы, сталі на яго пазіраць ды пытацца, што ён робіць. «Ну як жа — усё па тэхналогіі, — з веданнем справы стаў тлумачыць Антон. — Дрэва спачатку трэба прагрэць і толькі потым...»

Ад рогату скалануўся лес! Здагадаўшыся, што смяюцца з яго, Антон разгублена глянуў на дзядзьку Янку, потым кінуў лямпу і подбегам рушыў прэч.

Дзеду потым пажаліўся: «Ну як жа так? Дзядзька ж сам сказаў мне пра лямпу!» — «Дык ён яшчэ і не тое табе раскажа, — папярэджваў унука дзед. — А ты, перш чым гэта зрабіць, і сваёй галаво падумай».

Патрэбны ўрок. Ці не так?

**Нэлі Тумаш,**
*Смаргонскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

Неасабісты суб'ектыў



# Па месяцавым календары

### Пра парадоксы, якія робяць жыццё нармальным

МАГЧЫМА, вам падасца дзіўным, але я, чалавек з вышэйшай адукацыяй, прафесійны журналіст (а значыць, ад пачатку скептык, які не вядзецца на розныя там эзатэрычныя штучкі), дзесьці з канца лютага пачынаю жыць, звяртаючыся да месяцавага календара. Клапатліва хаваю яго — дзве старонкі з газеты — у верхнюю шуфлядку камоды, каб, крый божа, не згубіць ці выпадкова не выкінуць. Адчуваеш сябе закладнікам гэтых паперак, але нічога зрабіць з сабой не можаш. І час ад часу ўсё роўна адчыняеш тую шуфлядку, звяраешся з табліцай (прычым нават бярэш лупу, каб не перабльтаць дробныя надпісы і даты), ці ўсё зрабіў у спрыяльны час... Вы думаеце, я пра стрыжку валасоў, лячэнне зубоў ці яшчэ пра нешта, звязанае са здароўем і прыгажосцю, што, цалкам, наўпрост залежыць ад фазы Месяца? Як бы не так! Больш за тое — ніколі ў жыцці, ідучы ў цырульню ці да стаматолага, асабліва не цікавілася, што там на небе — поўня ці збыта... Я зусім пра іншае, больш важнае — пра расаду...

СМЕЙЦЕСЯ-смейцеся, але гэта сапраўды вельмі важна. Вось, напрыклад, замачыла нядаўна насенне памідораў з тым, каб пасеяць іх у нядзелю, 10 чысла. А потым адкрыла шуфлядку, глянула ў каляндар — памылачка выйшла. Не дзясятага трэба сеяць, а адзінаццатага або дванаццатага. У змаганні з розумам і логікай (якая розніца — на дзень раней ці пазней?) перамог месяцавы каляндар. І замест таго каб спакойна, не спяшаючыся, пасеяць тыя памідоры ў выхадны дзень, я рабіла гэта назаўтра позна ўвечары, вярнуўшыся з работы. Лягла спаць, заплюшчваю вочы — а ў іх так і лезуць дробныя светлыя семачкі на чорнай зямлі...

Далей — болей. Пытаюца: ты ж у маі частку водпуску хочаш узяць, калі менавіта пойдзеш? А я: так адразу не скажу, трэба ў каляндар паглядзець. Прыходжу дадому, адчыняю шуфлядку... Ага, вось тут агуркі можна сеяць, а тут расаду ў цяпліцу высаджваць. Карацей, паміж агуркамі і цяпліцай трэба тыя два тыдні і браць... Зрэшты, да мая яшчэ далёка, а вось хутка сад абразаць. Таксама трэба з календаром зверыцца, калі найлепш гэта рабіць. А то вызваніш людзей, грошы аддасі, а яно акажацца — не ў час.

РАЗУМЕЮ, што гэта падобна на лёгкую прыдуркаватасць (ах, які трапны ў нашай мове аналаг рускаму інтэлігентна-асцярожнаму «слабоумие»), але нічога зрабіць з сабой не магу. Пачынаю аналізаваць, чаму менавіта ў гэтых агародна-садовых клопатах усе свае дзеянні звяраю з нейкім там Месяцам? Шчыра веру, што ён сапраўды на штосьці ўплывае? Ды не, інакш і іншыя б сферы жыцця пад яго падладжвала. Навошта тады? А каб усё атрымалася. Каб, калі што пойдзе не так, не ўздыхаць скрушна: гэта ж не ў тую пару пасадзіла. А навошта — каб усё атрымалася? Навошта ўсё гэта ўвогуле, калі ёсць прыстойная зарплата, ёсць побач з домам вялікі супермаркет, у якім круглы год чаго хочаш: і памідоры, і бататы з лаймамі...

Навошта? Бо ёсць кавалак зямлі. Нават два кавалкі, па абодва бакі вуліцы. Невялікія, з улікам пабудоў на іх, садовых дрэў і кустоў, вялікага падворка з кветнікамі. І ты на гэтай зямлі гаспадар. Канешне, можна засеяць усё газонай травой і паліваць яе ды падкошваць і радавацца, што няма больш клопату... Толькі не атрымліваецца. Сялянскія гены, ведаеце, іх пальцам не размажаш. І гэта з дзяцінства бачанае дзіва, якое і праз усё жыццё дзівам застаецца: калі з маленькага семечка ці якога карэньчыка з'яўляецца з-пад зямлі кволы парастак, а пасля расце, расце, красуе, дае ўраджай — а ты да ўсяго гэтага маеш непасрэднае дачыненне, бо гэта ты яго пасадзіў...

І вось атрымліваецца сітуацыя, якая не падасца дзіўнай і парадаксальнай, бадай што, толькі беларусам. Жыве сабе чалавек у добраўпарадкаванай гарадской кватэры. Працуе ў сур'ёзнай арганізацыі. Чытае па дарозе на работу кнігу Муракамі. Вывучае ў сеціве афішу Вялікага тэатра — хоча схадзіць на «Іаланту». Бярэ інтэрв'ю ў кіраўніка буйной дзяржаўнай установы. Плануе наступны нумар рэспубліканскай газеты... А прыйшоўшы дадому, дастае з шуфлядкі і вывучае пад лупай месяцавы каляндар і цэлы вечар поркаецца з зямлёй і насеннем, старанна кладучы яго па некалькі каліў у зямлю, прыклейваючы цэтлікі з назвамі сартоў, укрываючы пад цэлафан, каб хутчэй узышло. І, што характэрна, лічыць гэта нармальным, звычайным жыццём, з якога выкінь хоць адзін з пералічаных складнікаў (а па логіцы, вячэрні, апошні, зусім не адсюль) — і яно, жыццё, ужо не будзе поўным, не будзе нармальным.

Зрэшты, гэта я, па сутнасці, сваімі словамі пераказваю тое, што ўжо даўно і больш таленавіта напісаў Караткевіч. Што неадной ўжо цытавала, але і тут трэба, бо, напісанае больш чым паўвека назад, яно сёння гучыць па-іншаму і, магчыма, так актуальна, як ніколі: «Таму мы такі моцны, трывалы народ, што праз усё наноснае ва ўсіх нас сядзіць звычайны мужык або баба. І культура, здаецца, і вытанчанасць, і размова пра Сомерсета Моэма, а павеяла сенам — і хочацца бабе басанож на траву; павеяла небяспекай — і празмерна культурны мужык лаецца беларускімі праклёнамі...»

УЧОРА, ідучы дадому, заўважыла на небе сярод хмар бляклы серпік маладзіка. Вісеў ён акурат у тым баку, дзе на агародзе ўжо адтайвае зямля, а сцены старой хаты пакрысе выпускаюць з сябе халодную вільгаць. Мы з ім па-змоўніцку пераглянуліся, я яму нават падміргнула і ўсміхнулася. У нас з ім ёсць адзін вельмі важны сакрэт. Зрэшты, вы і самі яго добра ведаеце.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**унитарному предприятию**
**«Запад-Телекомнефтепродукт»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения

**Электронные торги состоятся 29.03.2024 в 11.00.**

**Лот № 1 в составе:**

**1. Узел связи «Вилейка»,** инв. № 631/С-64631, 212 кв. м.

**2. Гараж,** инв. № 631/С-57942, 59 кв. м.

Адрес: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Стахановская, 215Б/1; 215б.

Земельный участок площадью 0,1093 га с кадастровым номером 621350100005000831.

Право аренды с 09.10.2009 по 01.11.2041.

**Начальная цена с НДС 20 %** – 56 590,40 руб.

**Задаток** – 5 659,00 руб.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Срок для подписания договора купли-продажи: в течение 20 (двадцати) рабочих дней после утверждения протокола о результатах электронных торгов.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 27.03.2024 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
